Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

САКАВІК 24 1933 г. № 65 (4609)

Год выданьня XVI

„Мы дабіліся таго, што ўзьнялі, дзякуючы калгасам, беднякоў да ўзроўню серадняко ў. Гэта вельмі добра. Але гэтага мала. Мы павінны цяпер дабіцца таго, каб зрабіць яшчэ адзін крок наперад і дапамагчы ўсім калгасьнікам, і былым бедняком, і былым серадняком,— узьняцца да ўзроўню заможных. Гэтага можна дабіцца, і гэтага мы павінны дабіцца ва што-б там ні стала“ (І. Сталін).

Даб'ем кулака, выганім лодыра з калгасных радоў, засеем, добра і ў тэрмін засеем увесь яравы клін

ПОСЬПЕХ СЯЎБЫ ВЫРАШАЕ БРЫГАДА

Дэлегаты першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, выступаючы ў спрэчках па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча, падзяліліся вопытам барацьбы за арганізацыю калгаснай вытворчасьці, за ўдарнае правядзеньне першай вясны другой, сацыялістычнай пяцігодкі.

Перадавыя байцы за калгасную справу, лепшыя людзі новай калгаснай вёскі расказваюць са зьезду ўсякай трыбуны, як яны самі, як іх калгасы, іх брыгады рыхтуюцца да сяўбы, што яны робяць, каб поўнасьцю, да аднаго гэктара засеяць яравы клін і рашуча павысіць ураджайнасьць калгасных палёў.

Выступленьні дэлегатаў — гэта яркая дэманстрацыя нашых гістарычных перамог у справе калгаслага будаўніцтва, гэта сьмелая, сапраўды бальшавіцкая, разгорнутая самакрытыка тых яшчэ сур'ёзных недахопаў, якія ёсьць у арганізацыі калгаснай вытворчасьці.

Аб чым гавораць выступленьні дэлегатаў? Які першы практычны выгад трэба зрабіць з гэтых выступленьняў для бальшавіцкага выкананьня нашай важнейшай і рашаючай задачы — задачы правядзеньня веснавой сяўбы?

Што галоўнае, што асноўнае ў справе падрыхтоўкі да сяўбы, што забясьпечвае ўзорную звышплановую сяўбу і высокі ўраджай?

Адказ адзін. Гэта — **ПАСТАЯННАЯ ВЫТВОРЧАЯ БРЫГАДА.**

Калі ў калгасе вытворчыя брыгады сапраўды замацаваны, калі ў гэтых брыгадах кожны калгасьнік цьвёрда ведае за што, за якую справу, за якіх коняй, машыны і інвэнтар ён адказвае, калі на чале брыгад стаяць лепшыя і вопытныя калгасьнікі — майстры калгаснай вытворчасьці, якія змагаюцца супроць лодыраў і прагульшчыкаў, за моцную працоўную дысцыпліну і якія згрупавалі вакол сябе падзейны вытворчы актыў, — дык гэта значыць, што посьпех сяўбы забясьпечан.

Выступленьні дэлегатаў яшчэ і яшчэ раз з найлепшай пераканаўчай сілай паказалі наколькі правільна і своячасова Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і СНК БССР указалі, што:

«Асноўным і рашаючым зьвяном у справе павышэньня ўраджайнасьці, узмацненьня сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, палітычнага і гаспадарча-арганізацыйнага ўмацаваньня калгасаў зьяўляецца пастаянная вытворчая брыгада.

Пастаянная вытворчая брыгада будзе гарантаваць посьпехі веснавой сяўбы, ад яе работы будуць залежаць вынікі барацьбы за высокі ўраджай і за даход калгасаў і калгасьнікаў, перш-наперш ў жыцьцё лёзунг тав. Сталіна — зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі.

Калгас імя АДПУ рапартаваў са зьезднарскай трыбуны аб сваёй поўнай гатоўнасьці да сяўбы. У мінулым гэта быў, бадай, самы горшы, самы адсталы калгас у Менскім раёне. А цяпер? Цяпер лепшыя ўдарнікі калгасу імя АДПУ з трыбуны зьезду заявілі фактамі і лічбамі аб бальшавіцкай гатоўнасьці да сяўбы, аб сапраўднай, а не славесным барацьбе за высокі ўраджай у іх калгасе.

У чым «сакрэт»? Ён ясьней ясьнага. Калгасьнікі цяпер перадавога і лепшага калгасу ў Менскім раёне — калгасу імя АДПУ — правялі палітычную і клясовую работу па арганізацыі і ўзмацненьні пастаянных вытворчых брыгад.

Калгас, ачысьціўшы свае рады ад клясава-варожага ахвясьця, стварыў і замацаваў пастаянныя вытворчыя брыгады, якія на справе сталі арганізатарамі баявой падрыхтоўкі да сяўбы, майстрамі высокіх бальшавіцкіх ураджаяў. На чале брыгад калгас паставіў лепшых і праверэных калгасьнікаў. За кожнай брыгадай замацаваны пэўны вучастак зямлі, пэўныя коні, інвэнтар і збруя. Брыгадзір вызвален ад дробнай апекі. Яму дасьцца поўная самастойнасьць, поўная магчымасьць праявіць сваю вытворчую ініцыятыву. Работа кожнай брыгады, кожнага калгасьніка ацэньваецца ў першую чаргу па якасьці — чым лепш брыгада ўзарала і апрацавала свой вучастак, чым лепш угнала яна свае пашы, чым лепш правяла ўборку ўраджаю, — тым больш даход атрымалі ў канцы мінулага году члены гэтай брыгады.

Ня менш яркай ілюстрацыяй таго, якія вынікі прынесьць па-бальшавіцку арганізаваныя вытворчыя брыгады ў калгасах, зьяўляюцца і факты, названыя ў прамове тав. Шапалашнікавай.

Тав. Шапалашнікава — прадстаўнік ад лепшага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці, расказала з трыбуны зьезду, як нашы суседзі — калгасьнікі-ударнікі Заходняй вобласьці арганізавалі работу брыгад у сваіх калгасах.

Яны ўстанавілі для кожнай брыгады дакладны вытворчы плян. Кожны брыгадзір мае брыгадную кніжку, плян-кожнай брыгады занесен на карту, дзе яшчэ ўказана колькі па які вучастак трэба выдаткаваць працадзён. Паміж брыгадамі разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва, у выніку якога насенныя фонды поўнасьцю сэкананы і ачышчаны, а інвэнтар і машыны цалкам адрамонтаваны.

Вось за гэту важнейшую, рашаючую справу, за справу бальшавіцкай арганізацыі работы ў пастаянных вытворчых брыгадах, чы і пачэсны ўзяцьце сапраўды па-баявому.

Усе брыгады, якія захавалі свой склад і выконвалі асноўныя сельскагаспадарчыя работы ў мінулым годзе, павінны быць зараз-жа замацаваны. Там, дзе гэтых брыгад няма, трэба неадкладна стварыць пастаянныя вытворчыя брыгады, замацаваўшы за кожнай брыгадай пэўныя вучасткі зямлі, коней, машыны, інвэнтар і збрую.

Тут трэба ўлічаць бюракратычнага падыходу. Зямельныя вучасткі, як правіла, павінны вызначацца ў суцэльным масыве, або ў непалёкай колькасьці вучасткаў, якія знаходзяцца адзін ад аднаго на недалёкай адлегласьці. Трэба ўсебакова ўлічаць спэцыфічныя асаблівасьці кожнага калгасу, размяшчэньне яго зямельных угоддзяў, месца сядзібных вучасткаў калгасьнікаў і г. д.

У нас ёсьць яшчэ надзвычай дробныя калгасы. У такіх калгасах, а іменна ў тых с.-г. арцелях, якія ядналіся менш 15 гаспадарак, стварыць пастаянныя вытворчыя брыгады на паляводзтву немэтазгодна. Тут трэба максімум увагі зьвярнуць на правільную расстаноўку людзей, трэба замацаваць за лепшымі калгасьнікамі найбольш адказныя работы, даручаючы апэрацыйнае кіраўніцтва паляводствам старшыні калгасу.

Нельга стварыць вялікіх, прамоздкіх брыгад. Гэта ў канцы канцоў пазьнізе толькі да абязьлічкі. Склад брыгады — у сярэднім 30-40 чалавек.

Работа брыгады ацэньваецца па дасягнутых ураджаях, па якасьці сяўбы і ўборкі. Гэта магутны стымул для лепшай арганізацыі справы, для лепшага правядзеньня сяўбы, для лепшай апрацоўкі глебы. Гэтым самым адкрываецца найшырэйшае поле для разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, для мабілізацыі вытворчай актыўнасьці калгасных мас.

Дык за справу-ж таварышы, стварым моцныя пастаянныя вытворчыя брыгады — рашаючае зьвяно ў справе бальшавіцкай арганізацыі калгаснай вытворчасьці!

Баяздольная вытворчая брыгада — гэта магутнейшая зброя ідэйнай барацьбы супроць рэшткаў клясавага ворага, супроць лодыра і прагульшчыка, за бальшавіцкія калгасы!

Будзем-жа біцца за тое, каб ня толькі засеяць увесь яравы клін, але і засеяць добра, засеяць так, каб атрымаць самы высокі ўраджай!

КАЛГАС „Х ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ“ ПАЧАЎ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ АЎСА

ЕЛЬСК. (НАШ КАР.).

КАЛГАС «Х ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ» РАСПАЧАЎ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ АЎСА.

20 САКАВІКА, У АДЗНАКУ ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІКАЎ, ЗАСЕЯНА ПАЎТАРА ГЭКТАРЫ. ВЫХАД НА ПОЛЕ ПАКАЗАЎ, ШТО КАЛГАС ПОЎНАСЬЦЮ ГАТОЎ ДА ВЯСНЫ, ГАТОЎ ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКІ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЎРАДЖАЙ.

21 САКАВІКА ЗВЫШРАНЬНЯЯ СЯЎБА ПРАЦЯГВАЛАСЯ. БРЫГАДА КАВАЛЁНКІ РЫГОРА ЎЗОРНА РАССТАВІЛА СІЛЫ Ў ПЕРШЫЯ ДНІ СЯЎБЫ.

ГРАВОДЗЯЧЫ ЗВЫШРАНЬНЮЮ СЯЎБУ, КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ «Х ЗЬЕЗД САВЕТАЎ БЕЛАРУСІ» ПАКАЗВАЮЦЬ УСІМ КАЛГАСАМ БССР, ЯК ТРЭБА ЗМАГАЦЦА ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ.

Учора на зьезьдзе

Ранішняе пасяджэньне 23 сакавіка

На ранішнім пасяджэньні 23 сакавіка ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў праходзілі спрэчкі па дакладу сакратара ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіча: «Першая бальшавіцкая вясна другой пяцігодкі і задачы калгасаў».

Першае слова ў спрэчках атрымлівае калгасьнік-ударнік тав. Векша, дэлегат ад калгасаў Дзяржынскага нацыянальнага раёну.

— Таварышы,—кажа тав. Векша,— наш раён нацыянальны, польскі. Мы паказалі, як, працоўныя калгасьнікі розных нацыянальнасьцяй могуць разам дружна працаваць над аднэй калектыўнай справай. Напрыклад, возьмем наш калгас імя «9-га студзеня». У яго ўваходзяць палякі, беларусы, яўрэі; ёсьць украінцы, татары і расійцы. У калгасе 143 гаспадаркі. Кулакі пускалі правакацыі, што яўрэі будуць у калгасе лішняй абузай, гаварылі, што з палякамі нельга ўжыцца, нельга будзе працаваць з украінцамі. Але мы сваёй працай і жыцьцём разьбілі ўшчэнт гэту контрэвалюцыйную хлусьню. За тры гады мы вырасьлі ў некалькі разоў. Калі ў нас было раней 300 га зямлі, то цяпер 1.135 га. Маем малочную фэрму на 150 галоў, больш за 100 коняй, стада сьвіней. Ёсьць садова-гародняя ферма, сад. Мы гатовы сустрэць веснавую сяўбу.

Вось якія нашы посьпехі.

* На гэтым-жа пасяджэньні горача спатканая зьездам выступіла дэлегатка Заходняй вобласьці, старшыня камуны «Чырвоная паляна» тав. ШАЛАПАШНІКАВА. Яна кажа:

— Мы сюды прысланы для таго, каб перадаць сваё братэрскае прывітаньне ад зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці і разам з тым падпісаць сацдагавор на лепшае правядзеньне веснавой сяўбы.

Прамова тав. Шалапашнікавай некалькі разоў перапынялася бурнымі воплескамі. Яна шмат спынілася на задачах жанчын—калгасьніц.

* Дружнымі воплескамі сустрэў зьезд выступленьне народнага камісара зямляробства БССР тав. Рачыцкага. У сваёй прамове тав. Рачыцкі пераважна гаварыў аб арганізацыі працы ў калгасах, аб задачах калгасаў у сёлетнюю веснавую сяўбу. Ён на канкрэтных прыкладах паказаў, як ня трэба арганізоўваць працы ў калгасах, прывёў узоры добрай арганізацыі працы ў шмат якіх калгасах.

* З вялікай увагай праслухаў зьезд прамову сакратара ЦК ЛКСМБ тав. Герцовіча, які прадэманстраваў узоры бальшавіцкай работы шматтысячнага камсамолу ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і падрыхтоўкі да веснавой сяўбы.

* * *

У спрэчках па дакладу выступілі калгасьнікі-ударнікі Зубкоўская, Лішай, Турбаеў, Балатынская, Рыбак і іншыя.

Перад закрыцьцём ранішняга пасяджэньня полацкая дэлегацыя ўнесла прапанову арганізаваць на зьезьдзе збор сродкаў на дапамогу германскім рабочым. Гэта-ж дэлегацыя першая ўнесла 15 рублёў. Зьезд аднадушна ўхваліў прапанову полацкай дэлегацыі і даручыў прэзыдыуму арганізаваць падпіску.

Вячэрняе пасяджэньне 23 сакавіка

На вячэрнім пасяджэньні адбываліся спрэчкі па дакладу тав. Шаранговіча. Першым выступіў прадстаўнік заводу Гомсельмаш тав. ГОФМАН, які сваю прамову прысьвяціў пытаньню асваеньня рабочым калектывам складанага абсталяваньня і новай вытворчасьці сельска-гаспадарчых машын. Прамоўца заклікаў дэлегатаў больш беражліва і ўважліва адносіцца да захаваньня машын, на выраб якіх савецкая дзяржава траціць вялікія сродкі.

З надзвычай цікавай прамовай выступіў дэлегат калгасу «РАСЬСЬВЕТ», Гомельскага раёну, тав. ЛУКАШОЎ. Прамоўца на прыкладзе свайго калгасу праілюстраваў барацьбу шырокіх мас калгаснага сялянства з кулацтвам, барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за павышэньне ўраджайнасьці, захаваньне каня, за баявую падрыхтоўку да веснавой сяўбы. «Расьсьвет» адзін са старэйшых і найбольш моцных калгасаў Гомельскага раёну. У калгасе ўжо на працягу трох год дзейнічае севазварот на плошчы 160 га. На гэтым кавалку зямлі, праз правільнае чаргаваньне культур, добрую апрацоўку глебы, раньнюю сяўбу, калгас дабіўся выключных паказальнікаў па павышэньні ўраджайнасьці.

З вялікай прамовай на зьезьдзе выступіў старшыня ЦКК КП(б)Б і нарком РСІ тав. ЛЫЧОЎ, спатканы доўгімі воплескамі.

Спыніўшыся на гістарычных перамогах, якія атрымала партыя і рабочая кляса нашай краіны па рэканструкцыі народнай гаспадаркі, па перабудове сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад, падкрэсьліўшы, што калгасы для працоўнага сялянства адзіна правільны шлях, тав. Лычоў робіць наступны вывад:

— Лепш, чым вы самі гаворыце і характарызуеце наша калгаснае будаўніцтва, ня скажа ні адзін прамоўца. Яркія посьпехі, дасягнутыя намі за апошнія гады ва ўмацаваньні калгасаў, у вашых выступленьнях знайшлі поўны адбітак.

Пераходзячы да задач, якія стаяць перад калгасамі ў сувязі з веснавой сяўбой, тав. Лычоў гаворыць:

— Толькі арганізаванасьцю сваёй пры выхадзе ў поле вы зможаце даказаць перавагі калектыўнай гаспадаркі над аднаасобнай дробнай гаспадаркай. Чым мацнейшыя будуць вашы калгасы, тым больш да вас будзе ісьці аднаасобнікаў. Але памятайце, што ня кожнага можна прымаць у калгас з тых, хто будзе да вас прыходзіць. Патрэбна надзвычайная пільнасьць. Фільтруйце кожнага, правярайце яго здатнасьць у вашых радох змагацца з клясавым ворагам, умацоўваць калгасную вытворчасьць.

Далей т. Лычоў падрабязна спыняецца на праблеме павышэньня ўраджайнасьці, і на прыкладзе калгасу імя Варашылава (Менскі раён) ілюструе, якія вялізарныя магчымасьці закладзены ў прыродзе нашых калгасаў.

Парыцкая дэлегацыя, — пачынае сваё выступленьне тав. КАХАНЧЫК, — уносіць на карысьць палітзьняволеных Германіі і Польшчы 70 руб. і заклікае пасьледваць нашаму прыкладу ўсе астатнія дэлегацыі.

Расказваючы пра жыцьцё і работу свайго калгасу і калгасаў Парыцкага раёну, выкрываючы недахопы, указваючы на факты кулацкай засьмечанасьці пасобных калгасаў, тав. Каханчык заключае:

— Я быў у Чырвонай гвардыі, у партызанскіх атрадах, змагаўся на франтох. Абяцаю перад тварам усебеларускага зьезду змагацца на палёх першай вясны другой пяцігодкі так, як я змагаўся з бандамі Бапаховіча, з белапалякамі, з кулакамі ў пэрыяд грамадзянскай вайны.

Пасьля кароткага выступленьня тав. Красьніцкага (Быхаў), опатканы працяжнымі воплескамі выступіў старшыня ЦВК БССР тав. ЧАРВЯКОЎ.

А 8-й гадзіне закрылася вячэрняе пасяджэньне. Дэлегаты пасьля закрыцьця разьехаліся для наведваньня Менскіх заводаў і фабрык.

БАРАЦЬБА ЗА ЛЁН--ГЭТА НАШ АБАВЯЗАК!

Прамова тав. ШАЛАПАШНІКАВАЙ--прадстаўніка зьезду калгасьнікаў-ударнікаў Заходняй вобласьці

Таварышы, дазвольце вам перадаць палкае прывітаньне ад нашай Заходняй вобласьці, ад ударнікаў-калгасьнікаў і калгасьніц, ад нашага першага абласнога зьезду. (Бурныя аплёдысмэнты).

Мы сюды прысланы для таго, каб перадаць сваё братэрскае прывітаньне і разам з вамі правесьці нашу бальшавіцкую вясну. Гэта вясна павінна нам даць тую ўраджайнасьць, на якую мы павінны сёньня з вамі заключыць дагавор, тую ўраджайнасьць, аб якой гаварыў т. Сталін.

Таварышы, калгасьнікі-ўдарнікі і ўдарніцы, мы павінны стаць заможнымі на нашых сацыялістычных палёх.

Зямля ў нас ёсьць, рукі ў нас, таварышы, таксама ёсьць, машыны ў нас ёсьць. Сёньня мы сабраліся сюды для таго, каб выкрыць недахопы, дапушчаныя ў мінулым, каб абмяняўцца вопытам, на-бальшавіцку, падбаяроку ўзяцца за веснавую пасяўную.

Я вельмі мала яшчэ тут, але бачу, што ўсе вы энэргічна пачынаеце вырашаць гэтыя пытаньні, асабліва жанчыны. (Бурныя аплёдысмэнты).

Таварышы жанчыны! Вы ведаеце, якая была справа наша раней —

ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ.

Г. КАЛТУНОВА — ударніца калгасу «Хваля», Веткаўскага раёну.

мыць, печ паліць. А цяпер кім стала жанчына? Выступае на такім вялікім зьезьдзе, пры такой колькасьці людзей і ўмела абгаворвае ўсё тое, што яна павінна зрабіць у веснавую пасяўную кампанію.

Таварышы жанчыны! Тав. Сталін сказаў, што мы, калгасьніцы — вялікая сіла. Мы павінны стаць яшчэ на галаву вышэй і тады, таварышы мужчыны, будзьце ласкавы дагнаць нашу жанчыну.

Мы — старшыні, мы — матарысты, мы — машыністы, па ўсіх нашых франтох апраўдваем наказ тав. Леніна аб тым, каб наша жанчына навучылася кіраваць дзяржавай. І яна кіруе ёю.

Таварышы жанчыны, у гэтым годзе яшчэ мацней перад намі паўстаюць задачы бальшавіцкай вясны, якія мы сёньня абгаворваем. Барацьба за лён — гэта наш абавязак, бо лён — наша золата. У нас часам бываюць такія выпадкі, калі жанчыны недасьведамляюць гэтай справы, ня ценяць гэтага залатога прыску.

Мы ўзялі на сябе абавязак у сваёй вобласьці атрымаць з аднаго га 3,5 цэнтн. І мы гэтага даб'емся. Я думаю, бачачы вашу актыўнасьць тут, што з вас ні адна ня будзе пратэставаць супроць гэтага, а будзе з намі спаборнічаць, а нават можа і перагонім нашу вобласьць.

Мы атрымалі летась 12 цэнтн. жыта з га, а некаторыя калгасы — 16 (я гавару аб сваім сельсавеце). Мы ўзялі абавязак дабіцца ўраджаю 17 цэнтн. з га — і будзе ня горэй. Мы, жанчыны, робім усё для гэтага.

Я хацела-б перадаць свой вопыт, як я кірую. Спачатку я баялася, а цяпер для мяне ня страшна нічога. Я старшыня камуны. Выбрана яшчэ ў праўленьні 3-х калгасаў — імя Ленінаму ім. У нас да веснавой пасяўной кампаніі рыхтаваліся так: вывезлі ссыпнага, збруя адрамантавана на 100 проц., гной вывезен поўнасьцю. Вытворчы плян устаноўлен на кожную брыгаду. Кожнаму брыгадзіру выдана брыгадная кніжка. У кожнага брыгадзіра ёсьць плян. Мы вылучылі вучасткі. Брыгады паміж сабой спаборнічаюць. У плане запісана, што на гэтым вучастку плянны ўраджай у столькі-та працадзён. Брыгадзір пагаджаць на плян і ведае ў колькі разоў ён павінен улажыцца. Другая брыгада — таксама.

Нашы калгасьнікі брыгадзіры ведаюць, што на 8 год замацаваліся на новым севазвароце на нашых вытворчых вучастках і здолеем іх прыстасаваць як трэба, не каб мы сябе падпарадкавалі зямлі, а каб нам зямля падпарадкавалася.

Самае галоўнае зараз тое, на што ўказаў на ўсесаюзным зьезьдзе тав. Якаўлеў, — нам патрэбна моцная працоўная дысцыпліна. Мы ведаем, што нам дае дысцыпліна. Дзе ёсьць дысцыпліна, там будзе і якасьць, і колькасьць. Мы цьвёрда ўзялі на сябе абавязацельства: калі ты не працуеш, дык на першы раз утрымаем 5

ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ.

ШЫМАНСКАЯ НАСЬЦЯ—Сьвінарка калгасу «Пераможац»

працадзён, а то і прабачай. Для нас, калгасьнікаў-ударнікаў, гэта зьяўляецца вельмі важным і я лічу, што за гэту справу трэба зачапіцца як сьлед, гады будзе дысцыпліна.

Што мы атрымалі па працадзень? Мы мелі ў сваёй камуне ў 1932 г. 36 гаспадарак, на сёньняшні дзень маем 48. Мы мелі ворнай зямлі 283 га. Колькі-ж было рабочых? — 85 чалавек. Вось вы падлічэце — з гэтых 283 га жанчыны вырасьцілі 63 га, прычым было ўсяго 40 жанчын. Вы падлічэце, колькі кожная жанчына ахапіла ільну? Наша жанчына моцна змагалася за лён. Яна ўбірала га за 6 дзён. І нашых стапурыцкіх нумароў ільнавалакна нахто не ахапіць, упе радзе яны ідуць. Вам, жанчынам, таксама трэба гэтым заняцца.

Што-ж мы атрымалі за працадзень? Калі мы вылічылі і дзяржаве, і фінансавыя плацяжкі, мы чыстыя перад дзяржавай, як ягад, і кожны калгасьнік атрымаў на працадзень рубль. У сярэднім кожная гаспадарка атрымала на працадзень: жыта 2,5 кілр., бульбы 3,5, сёну 600 гр., атрымалі на працадзень 1 кілр. 700 гр. мяса валовага, плюс сьвініны 500 гр. Што, калгасьнікі - ўдарнікі, можна жыць? Можна.

Памятайце, што вы — ударніцы на нашых сацыялістычных палёх. Дык будзьце-ж ударнікамі на выкарчаваньні кулакоў, якія перашкаджаюць нам будаваць. Некаторыя думаюць, што зараз усюды няма кулака. Гэта няправільна. У нас, таварышы, ёсьць кулакі. Чаму я так рэзка вам гавару? Факт, што нашы калгасьнікі часам яе прыкмячаюць гэтых кулакоў. Кулак працуе ня так, як працаваў раней. Вось возьмеце, да прыкладу, мой калгас. Быў адзін «стопроцантны бядняк», але гэты «бядняк» калісьці меў млын. Калі я прыбыла ў калгас, ён там быў. Пытаюся — кулак гэта ці не? Калгасьнікі гавораць: «Ды што ты, ён стопроцантны бядняк, у жыцьцях ходзіць». Ды як-жа ён млын меў? У рэзультаце мы яго выключылі з калгасу, таму што праз два тыдні ён тры сьвінаматкі ўкраў. Падгаварыў бацьку і выкраў самых пародзістых сьвінаматак. Можна сёньня сказаць, што кулакоў няма? Не. Яны ня з тоўстым пузам цяпер, а незавідныя па выгляд.

Таму я лічу, таварышы, жанчыны, вы павінны сачыць за тым, каб у нашых калгасах ня было такіх здадзеяў. Вы зробіце гэта сваім абавязацельствам і разьехаўшыся пасьля нашага зьезду ўкараніце гэта ў сьвядомасьць калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Канчаючы, я яшчэ раз горача вітаю ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў і ўдарніц.

Няхай жыве ленінская партыя і яе правадыр т. Сталін!

Няхай жыве братэрскі Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве Чырвоная армія на чале з тав. Варашылавым!

ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ.

АМОСАВА — ударніца камуны імя Сталіна, Сіроцінскага раёну.

ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ ЗЬЕЗДУ

У нас есьць усе--зямля, машыны, насеньне. Даб'емся-ж поўнай перамогі на пасеўным фронце!

Н. ДАВІДОВІЧ

Дэлегатка зьезду ад калгасу „Камбайн"

СЯЎБУ ПРАВЯДЗЕМ ЗА 10 ДЗЁН

Наш калгас «Камбайн» выклікаў на спаборніцтва калгасы «Бальшавік» і «Камінтэрн». Разгарнулася сацспаборніцтва паміж брыгадамі, унутры брыгад, паміж асобнымі калгасьнікамі і калгасьніцамі.

Па-баявому прывядзем веснавую сяўбу. А ці падрыхтаваліся мы? Так, падрыхтаваліся: і насеньне ёсьць поўнасьцю, адсартавана, ахоўваецца пільна; коні разьбіты на групы па працаздольнасьці, даглядаюцца добра, кормяцца па нормах: 10 клг. сена, капюшны і рэзкі — 8 клг., аўса 2 клг. у часе ўзмоцненай працы, вупраж падагнана і кадры кіраўнікоў у калгасе падрыхтаваны: машыніст, старшы конюх, тры трактарысты, загадчык СТФ, брыгадзіры і палаводы — 3, загадчык ясьлей — 1.

На вытворчай нарадзе абмяркованы задачы веснавой сяўбы гэтага году, вызначаны наступныя канкрэтныя мерапрыемствы:

Скончыць сяўбу збожжавых і тэхнічных культур за 10 дзён, а гародніны, бульбы, кораньплодаў — за 15 дзён; не дапусьціць ніводнага прагулу, працаваць бяз выходных дзён.

Радковай сеялкай засеяць усю плошчу яравога кліну; кантрольнымі лічбамі ўзьняцьця ўраджайнасьці пасобных культурах вызначана: па збожжавых — 11 цэнтн., бульба — 150 цэнтн., ільна-валакна — 3,5 цэнтн.

Адзін га засяваем у фонд абароны краіны, і адзін га для шэфаў рабочых.

Усю работу ў часе веснавой сяўбы, уборкі і рэалізацыі прадукцыі будзем праводзіць на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Посьпехі нашы будуць забясьпечаны правільным партыйным кіраўніцтвам. Партыйна-камсамольскія сілы ў нас разьбіты па брыгадах. Апроч таго, у кожнай брыгадзе вылучаны групавыя агітатары.

Не забываем пра свае абавязкі і перад дзяржавай па выкананьні плянаў загатовак. Так, плян збожжазагатовак выкананы на 300 проц.: замест 4 тон здалі 12 тон. У парадку калгаснага гандлю прадалі калгасам 6,8 цэнтн., калгасьнікі з ліку прадуктаў, якія атрыманы па працаднёх, прадалі 10 цэнтн.

І, ня гледзячы на гэта, мы атрымалі па працадні: жыта — 1 клг. 660 гр., ячменю — 547 гр., аўса — 510 гр., пшаніцы — 182 гр., грошай — 98 кап. Проса і грэчкі — 165 гр., бульбы — 5 клг. 600 гр., кораньплодаў і буракоў — 2 клг. 4 гр., сена і саломы — 5 клг. 300 гр. Добра забясьпечаны калгасьнікі. Але, па-бальшавіцку правёўшы веснавую сяўбу,— а мы яе правядзем па-бальшавіцку,— у наступным годзе дзяржаве здамо яшчэ больш, сябе забясьпечым яшчэ лепш.

СЛУЦКІ РАЁН.

П. В. ЖАЎРЫД

Старшыня калгасу імя Сталіна

УРАДЖАЙ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД БРЫГАДЫ

З вялікай радасьцю сустрэлі нашы калгасьнікі паведамленьне аб тым, што нам прадастаўляецца права паслаць дэлегата на ўсебеларускі зьезд калгасьнікаў-ударнікаў.

— Значыць заслужылі, працу, значыць, нашу ведаюць і цэняць, — гаварылі калгасьнікі.

У 1931 г. партыйная ячэйка накіравала мяне старшынёй праўленьня ў калгас «Новы будаўнік». А да таго часу верхаводзіў там былы балаховец Ігнатовіч Іван. Ён разбураў калгас. Як толькі скасілі сена, Ігнатовіч распарадзіўся раздаць па 5 вазоў кожнаму, хто мае карову. Ураджай таксама пачаў быў дзяліць па-кулацку, у залежнасьці ад абагуленай колькасьці зямлі. Працадні ён і ў разгон ня прымаў, і бывала, што, напрыклад, сям'я лепшага калгасьніка ЗАБЕЛЫ Антона, якая выпрацавала 700 працадзён, атрымала ўсяго толькі 8 пудоў збожжа. А балахавец Ігнатовіч над гэтым злосна пасьмейваўся:

— Што, наелися калгаснага хлеба?

Мы разам з партыйнай ячэйкай парашылі неадкладна скасаваць гэты кулацкі прынцып. І калі правялі разьмеркаваньне ўраджаю па працадзёнах, дык выйшла, што сям'я калгасьніка Забелы атрымала жыта 42 пуды і пшаніцы — 4 пуды, апроч іншых збожжавых культур. Ігнатовіча адклалі пад суд. Пасьля гэтага, рэзка зьмяніўся настрой калгасьнікаў і праца ў калгасе зусім па-іншаму пашла. Калгас пачаў расьці ўверх.

У самы разгар падрыхтоўкі да веснавой сяўбы, у сакавіку месяцы мінулага году, мяне пераелі ў калгас імя СТАЛІНА, дзе я і быў выбран старшынёй праўленьня. Хутка надыходзіў час разгортваньня палявых работ, а ў нас не хапала рабочай жывёлы, дрэнна справа была і з насеньнем.

Паставілі гэта пытаньне на сходзе парт'ячэйкі, пагаварылі і прышлі да вываду — аб'яднаць наш калгас з суседнім невялічким калгасам «ВЫЗВАЛЕНЬНЕ», дзе налічвалася толькі 7 гаспадарак, а коняй было шмат лішніх. Калгасьнікі са здавальненьнем прынялі такую прапанову і аб'ядналіся. Такім чынам, мы ліквідавалі прабел у недахвоце цягавай рабочай сілы і, падняціснуўшы на мясцовыя рэсурсы, насеньнем забясьпечыліся. А каб не цярпець падобных недахопаў мы сур'ёзна падумалі над тым, каб узьняць ураджайнасьць у калгасе. Для гэтага мы вывезьлі шмат гною з вінакурнага заводу, добра ўгнаілі поле і правялі раньнюю сяўбу, закончыўшы яе да тэрміну. Брыгадзірамі паляводных брыгад паставілі лепшых калгасьнікаў МАГІЛЕЎЦА Рыгора, кандыдата партыі і МІНЧЭНЯ Язэпа Цімохава, якія забясьпечылі добраякасную апрацоўку глебы і ўборку бяз страт.

Такім чынам, мы ўжо ў мінулым годзе дабіліся павышэньня ўраджайнасьці ў такіх лічбах:

		Жыта.	Пшаніца	Авёс.	Ячмень.
Ураджай	1931 г.	5,6 ц.	6,0	5,2	9,0
	1932 г.	6,6	11,9	8,4	14,5

Пасьля выкананьня абавязкаў па загатоўках перад дзяржавай і ссыпкі насенных і страхавых фондаў, па канчатковым разьмеркаваньні ўраджаю выйшла на працадзень па 2 клг. жыта, 1,8 клг. яравых культур, па 8 клг. бульбы і 73 кап. грошыма. АБ ТАКІХ ПРЫБЫТКАХ І НА МАРЫЛІ НАШЫ КАЛГАСЬНІКІ КАЛІ ЯНЫ ПРАПАВАЛІ ПА АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ.

За ўдарную работу 13 калгасьніц і 9 калгасьнікаў—МЯДЗЬВЕЦКАЯ Дар'я, ХРУШЧОВА Елізавета, МАСЭЛЯНІКАВА, ЧАРТУН Іван, КАРНЕВІЧ і інш. прамізваны. А подыраў, падрыўшчыкаў працоўнай дысцыпліны мы білі. За парушэньне працоўнай дысцыпліны 3 чал. аштрафавалі па 3 працадні, а некаторым абвешчаны на сходзе вымовы. Напрыклад, Чырскі Кастусь часамі адмаўляўся выконваць даручэньні брыгадзіра і самаўласна браў каня са стайні для сваіх патрэб. Яго аштрафавалі, ды на сходзе моцна прабралі, глядзіш, пасьля гэтага чалавек справіўся. Але цяпер мы больш моцны курс бярэм на працоўную дысцыпліну..

Мы будзем змагацца за гэту справу, як змагаюцца рабочыя на прадпрыемствах. Нядаўна мы выкінулі з калгасу ШАБЛОЎСКАГА Івана, які адной нагой быў у калгасе, а другой стаяў за парогам. Ня толькі ён сам пляновуўся працаваць, але і жонку ня пускаў на працу. З такімі людзьмі мы ня цацкаемся.

Вышыбілі таксама з калгасу і яўных кулакоў КОРБУТА Івана і МЯНЧЭНЮ Язэпа Васілёва, якія гнулі ў свой бок хаця і мала прыкметна гэта было з надворнага выгляду. З дапамогай калгаснага актыву мы выкрылі іх шкодніцкія махінацыі і паказалі ім дарогу за калгасныя вароты.

Як мы гатовы да сяўбы? Насеньне ссыпана і ачышчана да 1 сакавіка. Поўнасьцю адрамантаван сельска-гаспадарчы інвэнтар. Наш кавань і стальмахі, якія займаліся гэтай справай, працавалі па-ўдарнаму. І зараз проста любо паглядзець, калі ўсё ў парадку.

Мы шырока абмяркоўвалі пастанову СНК і ЦК УсеКП(б) аб падрыхтоўцы рабочай жывёлы да веснавой сяўбы. Конюхамі, выпучылі лепшых калгасьнікаў. Аслабілі ад працы 7 слабейшых коняй, каб іх падправіць да пачатку сяўбы.

Правяраючы апошнюю ўсесаюзнага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў, першая брыгада заключыла дагавор па сацыялістычным спаборніцтве з другой брыгадай на лепшае праведзеньне веснавой сяўбы і павышэньне ўраджайнасьці. 13 калгасьнікаў заключылі між сабой індывідуальныя дагаворы па сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Такімі мерамі прэды мы з посьпехам справіліся з заданнем лепшае бальшэвіцкай весны другой пяцігодкі. Мы разам усе ўмеем для таго, каб зрабіць усіх нашых калгасьнікаў, як сказаў т. Сталін, — заможнымі і сэнсэ зрабім.

СЛУЦКІ раён.

„МЫ ГАНАРЫМСЯ НАШЫМІ ПОСЬПЕХАМІ"

Прамова калгасьніцы т. Кароль (калгас імя К. Маркса, Слуцкага раёну)

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы, рабочыя ўдарнікі фабрык і заводаў, дазвольце перадаць вам шчырае прывітаньне ад калгасаў Слуцкага раёну.

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы! Я, калгасьніца калгасу імя К. Маркса была выбрана дэлегаткай на ўсесаюзны зьезд калгасьнікаў-ударнікаў. Я хачу тут вам сёньня расказаць, што бачыла сваімі вачыма і чула сваімі вушамі.

Усесаюзны зьезд адкрыў т. Кагановіч, які зрабіў нам справаздачу аб першай пяцігодцы. Калі нам у калгас прывозілі машыны, дык некаторыя, гэта значыць, кулакі, стараліся даказаць, што гэтыя машыны не вырабляюцца на нашых заводах. Тав. Кагановіч сказаў, што быў час, калі дзяржава давала значныя сродкі за пазыкі і атрымлівала тыя ці іншыя машыны, а цяпер мы іх самі выробляем у сябе на заводах. Гэта так. Я гэтыя машыны бачыла сваімі вачыма, і яны нічым не адрозьніваюцца ад машын замежных.

Мы на ўсесаюзным зьезьдзе набраліся шмат энэргіі. Мы бачылі, як рабочыя нашых фабрык і заводаў сапраўды працуюць бальшавіцкімі тэмпамі. Мы павінны тавярыцца іх працай. Усе рабочыя адказваюць за сваю працу і хварэюць душой калі што ня так зробіта. Рабочыя на прадпрыемствах працуюць ня толькі так, каб тую ці іншую колькасьць часу прастаяць ля варштатаў, а каб выканаць даныя дзяржавай заданьні.

Мы былі на аўтамабільным заводзе, і я сваімі ўласнымі вачыма бачыла, як вырабляюцца аўтамабілі. Вялікае дасягненьне. Мы павінны тэтым ганарыцца. Як на гэтым заводзе пастаўлена праца? З аднаго канца пачынаюць складваць асобныя часткі, а з другога—ужо выходзіць гатовы аўтамабіль. На гэтым заводзе працуюць таксама і жанчыны.

Цяпер я скажу вам, што нам сказаў т. Будзённы аб догляде за канём. Ён нам сказаў, што мы павінны даглядаць каня, як матка сваё дзіця. Да гэтага часу ў нас былі выпадкі, калі ў калгас, у прыватнасьці, на стайню пралазілі варожыя нам людзі, якія замест таго, каб даглядаць каня, каб конь быў гатовым да пасеўнай кампаніі, імкнуліся папарваць яго сілы. Мы змагаемся за свайму калгасу пераглядзець свае рады і ачысьціцца ад кулакоў, якія шкодзілі нам у працы.

Тав. Будзённы так сказаў, каб коней паглядалі лепшыя калгасьнікі-ўдарнікі, каб яны ня думалі, што ім трэба раней паесьці, а потым можна і каня пакарміць. Трэба, каб было наадварот—раней каня пакарміць, а потым самім паесьці (воплескі).

Вось, таварышы, калі я прыехала з ўсесаюзнага зьезду, зьвярнулася я да свайго праўленьня, і мы пераглядзелі як у нас робіцца ў нашых калгасах, ці добра работнікі стаяць на пасту, ці добра ў нас догляд за канём, за жывёлай. Мы пераглядзелі ўвесь склад. Праўда, на стайні мы зьмянілі аднаго конюха, бо ён шкодзіў. Мы выбралі лепшых коней і ўзялі таксама пекальні і горных, мы горных пастанавілі на ўзмоцнены корм, мы вызвалілі іх ад усякай працы, каб іх падмацаваць да веснавой пасеўнай кампаніі.

Таварышы калгасьнікі і калгасьніцы! Я павінна сказаць, што мы, калгасьнікі, таксама павінны паставіць такую арганізацыю працы ў сваіх калгасах, як пастаўлена праца на нашых фабрыках і заводах (воплескі), бо я думаю, таварышы, што мы не абылкія калгасьнікі, а мы ўсё-ж такі калгасьнікі моцныя, і мы павінны хварэць за сваю работу і выконваць і перавыконваць свае нормы, таксама як выконваюць і перавыконваюць рабочыя фабрык і заводаў (воплескі).

Таварышы, я раскажу пра свой калгас. Наш калгас арганізаваўся ў 1921 годзе. У калгас я ўступіла ў 1926 годзе. Зразумела, таварышы, праца не вялася яшчэ так, як на сёньняшні дзень. Тады не дзялілі на працадзень, а дзялілі па рабоце. І гэта, зразумела, ня было верна, бо добраму працаўніку, які змагаўся за тое, каб узьняць калгас, яму ня было жыцьця ў калгасе. А калі наш урад і партыя ўстанавілі працадні, дык гэта нашым калгасьнікам, якія стараюцца ўзьняць нашы калгасы і зрабіць іх бальшавіцкімі, гэтыя працадні далі нашым калгасам магчымасьць зажыць новым жыцьцём. Бо наш калгасьнік, які добрасумленна працуе, адчувае, што калі ён зробіць больш працадзён, ён будзе есьці лепей.

Таварышы, я яшчэ скажу, як мы падрыхтаваліся да веснавой пасеўкам пані. Калі я прыехала з ўсесаюзнага зьезду, мы, прапрацаваўшы адоўву зьезду, а таксама і выступленьні тав. Сталіна на гэтым зьезьдзе, які ўказаў нам шлях, добры шлях нашым калгасам, каб мы сталі заможнымі. Мы ачысьцілі насеньне поўнасьцю, а таксама страхавыя фонды ссыпалі на 100 проц., адрамантавалі інвэнтар, транспарт і ўсе прылады.

Мы таксама свае палі разьбілі па брыгадах і за кожнай брыгадай прымацавалі пятаную сяку і коней, а так сама інвэнтар, транспарт, плугі, бораны. На сёньняшні дзень у нас у калгасе ёсьць 67 гаспадарак, а з іх усіх працаздольных мужчын 63, жанчынаў у нас перавышае—68 (воплескі).

Скажу аб жанчынах. Нашы жанчыны не павінны быць адсталымі. Наш правадыр т. Сталін нам сказаў на ўсесаюзным зьезьдзе, што наша жанчына—вялікая сіла ў калгасе. Яна ўжо мае вялікія дасягненьні ў нашым калгасе. Таварышы жанчыны, нам калгасьнікам, урадам аказваецца ўсялякая дапамога, што мы хочам—тое даюць. Мы дацелі, каб нам далі, сваю карову—нам яе далі. І нам т. Сталін так сказаў, што ў каго яшчэ няма каровы, абяцаем яе даць. І мы таксама ў сваім калгасе, у якіх каровы ня было, мы ім далі. Таксама ў калгасе ёсьць сьвіньні і ўсё астатняе. І таму, таварышы, я думаю, што ўсё-ж такі, мы, жанчыны, не павінны падкачаць, а павінны ўзьняцца на яшчэ вышэйшую ступень (воплескі).

Таварышы! Наш калгас імя К. Маркса ідзе, як перадавы ў Слуцкім раёне. З нашага калгасу на ўсебеларускі зьезд выбралі дзьвюх жанчын (воплескі). Таксама на раённы зьезд з нашага калгасу выбралі 3-х (2 жанчын і 1 мужчыну) (сьмех, воплескі). Дык бачыце, таварышы, што ў нашым калгасе ўжо перавышаюць жанчыны (воплескі). І я павінна сказаць таксама адсталым жанчынам, каб вы таксама білісь за свае правы, каб вы таксама мелі роўнаправе з мужчынамі, каб вы таксама ўдзельнічалі ва ўсіх працах, як і мужчыны.

Таварышы! Я скажу пра сваю калгасьніцу, якая прысутнічае тут на ўсебеларускім зьезьдзе, як яна змагаецца за ўдарную работу. Яе завуць Ліза Еўроцкая, і яна сапраўды змаганца за павышэньне ўраджайнасьці і не баіцца працы. Вось, у нас бывае яшчэ, калі жанчыны сьвяткуюць усялякія долгійныя сьвяты і такія жанчыны, якія спачуваюць гэтым сьвятам, ня хочуць выйсьці на работу. Яна ж, Ліза, у нас ідзе перадавой, яна не глядзіць на тое, ідуць рабочыя, або не, яна выходзіць адна на работу і працуе (воплескі). Так што бачыце, нашы жанчыны не баіцца працаваць.

Хаця нас кулакі страшылі, што ў калгасах паздыхаеце з голаду, але ўсё-ж, мы на справе здолелі зарганізаваць свае калгасы і забясьпечыць калгасьнікаў тымі прадуктамі, якімі патрэбна, якіх мы ня мелі раней, калі былі аднаасобнікамі. Нехай паздыхаюць кулакі, якія сьмяяліся над намі! (Воплескі). Мы перамаглі ня зло кулаком! Мы жывем, расьцем і будзем далей яшчэ больш расьці!

Таварышы калгасьнікі, калгасьніцы! Мы будзем, вядома, змагацца за тое, каб павысіць ураджайнасьць, каб сьпраўляць нашы калгасы да заможных гаспадарак, каб кожны калгасьнік адчуваў, што ён жыве ў калгасе, а ня так, як жыў у аднаасобнай гаспадарцы.

Некалькі слоў скажу пра сябе. Калі я была дзяўчынкай, я нават ня мела ботак на ногах, і калі было вясельле, або вечарынка ў нас, кулакі абувалі бацінкі, а мы замест таго, каб абуць бацінкі абварачвалі ногі анучамі. На сёньняшні дзень кожны калгасьнік і калгасьніца абуты ў бацінках і галёшах. Гэта, таварышы, ёсьць вялікае дасягненьне, дасягненьне нашага калгасу і мы, таварышы, павінны ганарыцца гэтымі дасягненьнямі.

Таварышы жанчыны! Мы, калгасьніцы, зараз ня жывем, так, як жылі нашы маткі. Нашым маткам прыходзілася працаваць на паменчыкаў, паменчыкі іх выганялі на работу. Нашым маткам прыходзілася брань сваіх дзяцей за плечы і ісьці на работу. Зараз нашы калгасы вызвалілі нас ад гэтай цяжкай работы. Нам, таварышы, адкрылі ясьлі, дзіцячыя сады, нашы дзеці ў ясьлях і ў дзіцячых садох добра даглядаюцца. (Воплескі).

Калі я жыла ў аднаасобнай гаспадарцы, я мела толькі адно дзіця і ня здолела яго выхаваць так, як на сёньняшні дзень выхаваны мае трое дзяцей. (Воплескі).

Нахай жыве наша камуністычная партыя!

Нахай, жывуць нашы фабрыкі і заводы!

Нахай жывуць нашы чырвонаармейцы!

Нахай жыве правадыр т. Сталін!

Нахай жывуць нашы калгасьнікі-ўдарнікі, калгасьніцы жанчыны Случчыны! (Гучныя воплескі).

Б. ПЕРКЕЛЬ

Дэлегатка зьезду ад калгасу „1-ы май"

БУДЗЕМ СЕЯЦЬ НА ЎГНОЕНЫХ ПАЛЁХ

Наш калгас — інтэрнацыянальны. Арганізаваўся ён ў 1929 г. І зараз налічваецца 159 гаспадараў. Ёсьць пры калгасе СТФ, у якой налічваецца 42 сьвінаматкі і ў МТФ — 143 кароў. Моцная і арганізацыйна, і гаспадарча наша гаспадарка.

А былі непаладкі, было проста шкодніцтва. У 1931 г. старшынёй калгасу быў Гіндэлевіч, вораг з партбілетам у кішэні, былы спэкулянт. Ён вёў гаспадарку да заняпаду, яму дапамагалі іншыя спэкулянты і кулакі, якія пралезьлі ў калгас.

Зараз мы ачысьціліся ад клясава-варожых элемэнтаў; вычысьцілі з калгасу 9 кулакоў і спэкулянтаў. Выключылі з калгасу і загадчыка СТФ, былога кулака Рубіцкага, на яго месца вылучылі жанчыну-бяднячку Гарэновіч Надзю. Старшынёй выбралі вытрыманага партыйца Васіля Каэбл. Наладзіліся справы. Узмацнілі працоўную дысцыпліну. Лодырам абвясьцілі вайну. Добрасумленна змагаліся за ўзьняцьце ўраджайнасьці, і вынікаў ужо за адзін петашні год дабіліся значных.

Ураджайнасьць нашых палёў павысілася. Ячмень у мінулым годзе з гэктара даў 10 цэнтн., бульба — 100 цэнтнэраў, гуркі — 44 тоны, капуста — 30 тон, памідоры — 10 тон, сталовых буракоў і мерквы — 15 тон.

Перад дзяржавай акуратна выканалі абавязкі. Збожжавых здалі замест 50 цэнтн., паводле пляну — 54 цэнтн., бульбы — замест 166 цэнтн., — 158 цэнтн., гародніны прапетарскім цэнтрам адправілі 67 вагонаў, па асобных відах у тры-чатыры разы больш, чым было вызначана па пляну.

У 1931 г. хлеба не хапала для калгасьнікаў, бо працевалі дрэнна, грошай ня было, усе былі ў пераборы. Сёлета на працадзень атрымалі: грашыма 3 р. 70 кап., збожжа — 1 кгр. 200 гр., бульбы—4 кгр. 100 гр., гародніны і садавіны—4 кгр. 500 гр. і, апрача таго, фуражны корм для сваёй жывёлы.

З пачатку арганізацыі калгасу бывалі такія выпадкі, што некаторыя калгасьнікі і калгасьніцы з яўрэяў ня ўмелі і цыбулю пасадзіць, а зараз ведаюць ужо складаную тэхніку сельска-гаспадарчай працы, на аснове ўказаньняў агранамеі. Напрыклад, я, калі жыла ў бацькі-краўца ня ведала сельска-гаспадарчай працы, а зараз лічуся спэцыялісткай, зьяўляюся памочнікам брыгадзіра, за год выпрацавала 323 працадні.

Мы на 1933 г. ставім цэнтральную задачу — высока ўзьняць ураджайнасьць. Да выкананьня гэтай задачы рыхтуемся прыкладна. Інвэнтар адрамантаван, ноні сяўбы, фуражом на час веснавой сяўбы забясьпечаны: забраніравана 300 пудоў аўса і лепшага сена 2.500 пудоў. Насенныя фонды ссыпаны, адсартаваны на трыерах. Вытворчыя брыгады складзены, сацспаборніцтва і ўдарніцтва шырока разгорнута ва ўсім калгасе як паміж асобнымі брыгадамі, так і паміж асобнымі калгасьнікамі і калгасьніцамі.

Другім калгасам дапамагаем у рамонце інвэнтару, напрыклад, калгасам «Рубеж», «Перыская камуна» і інш.

Для таго, каб высока ўзьняць ураджайнасьць, вось як мы будзем угнойваць глебу. Гною вывезьлі 5 тыс. вазоў, а ўсяго мяркуем вывезьці 6.500 вазоў. Попелу ўжо сабрана пры дапамозе піянэраў і жанчын-дэлегатак 120 тон. Штучнага ўгнаеньня вывезьлі 10 тон. Угнаеньне зьбіраем дзе толькі можам, бо ўсе зразумелі важнасьць узьняцьця ўраджайнасьці. Вось цікавы прыклад. У суботу, 18 сакавіка нават старухі-яўрэйкі, у гэты традыцыйны «сьвяты» яўрэйскі дзень, выйшлі на базар і зьбіралі гной.

Вялікай сілай становяцца жанчыны, арганізаваныя ў калгасах.

СЛУЦКІ раён

У цэнтры дэлегат зьезду тав. ВЕТАШКОЎ — арганізатар калгасу «МОПР», (Віцебскі раён). Калгас арганізаван у 1929 годзе

ШЭНДЗЕЛЕВЫ

У камуне «ПРАГРЭС» Шэндзелева Аўдоцьця з 1929 году. Трапіла сюды такім чынам. Спачатку брат мужа, які служыў у Чырвонай арміі, уступіў у гэту камуну, потым і астатнюю сям'ю перацягнуў.

З першага году калектыўнай працы Дуня паказала сябе, як лепшая ўдарніца. Што ні даручалі ёй — ці работу на полі, ці на малочнай фэрме — усё гарэла ў руках камунаркі. Уся сям'я Шэндзелевых працавала па-ўдарнаму. Нават нямы брат мужа — адзін з лепшых ударнікаў, кожны год прэміраваны. Па ўдарніках Шэндзелевых равняліся і іншыя. У выніку расла гаспадарка, рос дабрабыт камунараў, акуратна выконваліся абавязкі перад дзяржавай.

У пачатку 1931 году сям'ю Шэндзелевых і яшчэ пяць чалавек лепшых ударнікаў паслалі камунары на сацыялістычную дапамогу калгасу «Чырвоны трудавік», тады-ж Глодзіцкага сельсавету. Калгас гэты быў засмечаны кулацка-варожымі элемэнтамі.

Пазнішла спачатку ў калгасе «Чырвоны трудавік» прыбылішчы на дапомогу камунараў. Шэндзелі кулакі на вуліцы, бацькі вугольных і проста ў вочы.

Бывала і такі, каб хлеб замясіць, нагодзяк бялізну пашыць не хапулі.

— Узялася я за гэту працу. Пасадзілі капусту, буракі, моркву і... салату.

Пачала расьці гародніна. Паліваць трэба, ад замаразкаў захоўваць — ня ідуць на работу, выкручваюцца. Пачала Шэндзелева арганізоўваць вакол сябе актыў бяднякоў і лепшых сярэднякоў. Тлумачыла ім, што працуюць на сябе-ж, а не на каго-небудзь.

Пастучова разьбівала кулацкі сабатаж.

Засадзілі гароды. Засеялі палі. Уборку правялі своечасова, хоць і з вялікімі прадасьцямі.

Паступіла восень. Пачынаці цёплы працы. Уралізілі гурбы, капусту, буракі, морква. Елі, салілі, прадавалі бедняк. Усе білі задаволены. Кулацкая агітацыя была разьбіта цэлай кампаніяй справай.

Прабыўшы год у калгасе Шэндзелева Дуня з сям'ёй пераехала ў камуну «Прагрэс». Яе і жанчын, якіх тут пасьлі, на любы вулкаў, куды паставіць працаваць. Зараз Дуня — ударніца, лепшая ў камуне. Яна — делегат зьезду калгасьнікаў-ударнікаў.

А. Н.

Аб увядзеньні севазваротаў у саўгасах і калгасах

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 15 сакавіка 1933 г.

Надаючы выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне ўвядзеньню севазваротаў у саўгасах і калгасах, як важнейшаму мерапрыемству па павышэньні ўраджайнасьці і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, адпаведных спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі БССР, згодных з запатрабаваньнем разьвіцьця сацыялістычнай гаспадаркі.

Пры ўвядзеньні севазваротаў у БССР патрэбна выходзіць з поўнага захаваньня збожжавага кліну, стварэньня ўстойлівай кармовай базы для разьвіцьця жывёлагадоўлі, захаваньня плошчы пад тэхнічнымі і прапашнымі культурамі і забясьпячэньня павышэньня ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі шляхам пашырэньня плошчы пад паравы клін, асабліва любінасы.

2. На працягу 1933 году правесьці работу па ўвядзеньні севазваротаў ва ўсіх саўгасах і калгасах.

3. Да распрацоўкі на мясцох па калгасах севазваротаў і ўвядзеньня іх у натуры,—лічыць неабходным выкарыстаньне да 70 проц. наўчнага складу агранамічнага на гэтай працы, пацьвердзіўшы неабходнасьць выкананьня поўнасьцю планаў мабілізацыі ЗСО агранамічнага для пасылкі на раён.

4. Ухваліць мерапрыемствы Наркамзему аб арганізацыі цэнтральнай рамісіі па севазваротах. Прапанаваць Наркамзему на працягу месячнага тэрміну (да 15 красавіка) разьвязаць і ўнесьці ў ЦК КП(б)Б пытаньні аб тым, з таксама разьвязаць і зацьвердзіць канкрэтныя севазвароты па ўсіх тэрміновых саўгасах і чырвоначарнейскіх калгасах.

5. Увядзеньне севазвароту правесьці пры шчыльнай увазе працы агранаўкі і зямляўпарадчыку. Правядзеньне ўсёй работы ў саўгасах і калгасах па севазваротах павінна праходзіць апіраючыся на актыўнасьць рабочых і калгасных мас, пры разгортваньні грамадзкай і масавой работы, праводзячы яе як адно з важнейшых мерапрыемстваў у справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і павышэньня ўраджайнасьці.

6. З увядзеньнем севазваротаў у саўгасах і калгасах павінны быць прыняты аграмерапрыемствы, як абавязковае правіла для саўгасаў і калгасаў, якія ўводзяць севазвароты.

Даручыць Наркамзему з прыцягненьнем навукова-дасьледчых устаноў і ў адпаведнасьці з кожным тыпавым севазваротам распрацаваць тыповыя прыкладныя аграправілы, як мінімум, пры ўвядзеньні севазваротаў, якія прымаюцца калгасам, зацьвярджаюцца РВК, пасьля чаго абавязковы да выкананьня.

7. Увядзеньне севазваротаў у саўгасах і калгасах, маючых вялізарнае грамадзка-палітычнае і гаспадарча-эканамічнае значэньне, павінна праходзіць пад знакам шырокай мабілізацыі ўсіх партыйных, рабочых, камсамольскіх і калгасных мас на поўнае і правільнае выкананьне гэтай задачы.

Даручыць культпрапу і агітпрапу абкому ЦК распрацаваць пад кіраўніцтвам ЦК рэкамендацыі на шырокае асьвятленьне на старонках друку задачы ўвядзеньня севазваротаў і правядзеньня масавай работы вокал гэтай задачы.

Мітмаскоўку адпусьці, разам з Наркамзем выдаць год гарантаваных бруш для пашуку дарэмных, спрыяць увядзеньню севазваротаў.

МНОЖЦЕ РАДЫ УДАРНІКАЎ
ПЕРШАЙ БАЛЬШАВІЦКАЙ ВЯСНЫ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Адам Значонак

Аднагодкі Адама Значонка рэдка злазяць з печы. Печ зімой і заваліна летам—іх сьвет. Самае вялікае, на што здатны, як правіла, аднагодкі Адама—гэта зьвіць пута, даглядзець малых упукаў, падлесьці лапці і прыпыхдку выкурыць люльку табакі.

Адам Вінцэсеў—калісьці іншага складу. Годы яго цягнуць на печ, ён упіраецца і едзе ў лес, старасьць прытрымлівае за ногі і прыказвае на працэбу—ён не абыходзіць міха і выходзіць у поле. Калі трэба—з касой, бераздай, плугам, сеўнай, а то і з пугай.

З пугай Значонак ідзе ў крайнім выпадку, толькі тады, калі па можа адбіцца ад упрошванняў чэлядзі праўленьня аднаводзіць пару дзён, папасьвіць цялят ці авечак.

— Пасу я аднойчы весь гэтак авечкі, а побач жыта нашы-ж калгасьнікі сеюць. Надвор'е добрае. Поле аж дымиць пад сонцам. Так мне і хочацца ўзяць сеўню і засеяць самім-жа архаваным жытам, якія гоні ці двое. Але ў жыце сёньня—авечкі, мне загадалі аднаводзіць. Нічога не зробіш,—адпачываю.

Адпачываю я, паволна ходзячы каля авечак, і бачу—Сьцяпан Рабушкін і Мацей Рабушкін—яны сеялі жыта—як толькі паедуць калгасьнікі з бераннамі пад вёску, дык яны ў хмызьняк. Пабудуць там пару хвілін і назад ідуць улегцы.

Нагадае за імі Адам і з кожнай хвілінай усё больш перакопваецца, што недарма браты Рабушкіны аглучаюцца з пахаці, носяць у хмызьняк яны жыта.

— У мяне аж у сэрца кальнула, калі я здагадаўся, што крадуць Рабушкіны калгаснае жыта, крадуць жыта, якое я, як і іншыя сумленныя калгасьнікі, зьбіралі з поля, каб і коласку ня высталася, малацілі, архавалі, на трыеры прачышчалі.

Адам кідае на некалькі хвілін авечак і бяжыць у вёску шукаць свайго сына камсамольца, брыгадзіра палявой брыгады.

— Гэта-ж сын вінават, што ў яго пад носам пагацюць калгаснае дабро.

Знаходзіць Адам Вінцэсеў сына.

— Калі ты так будзеш глядзець за калгасным дабром, прыязджа табе, сынку, занесьці ў Заслаўе сваю камсамольскую кніжку.

Сын пытае, у чым справа? Стары пакуль не гаворыць, чытае натацыю.

— Ды ж'к ты камсамол пасьля гэтага, калі ў цябе на полі крадуць.

Сын зразумеў у чым справа і пачынаецца бегчы на поле, каб Рабушкі іх, якія ляўно ўжо заматозраны старым Асопам у пакражах, замяніць іншымі калгасьнікамі-сейбітамі. Адам схапіў сына за пінжак.

— Дурніца! Куды ты? Пачакай, па слухай мяне старога. Яны яшчэ ня зжэнуцца. За імі трэба толькі сачыць да вечара. Там нецалёка стаіць елка. Я-б табе раіў залезьці на елку—адтуль добра відаць—і пагледаць за злодзеямі. Я-б сам гэта зрабіў, але ў мяне аўстэі, я аднаводзіць павінен,—ужо са злосьцю прагаварыў стары.

Калі ўсе за межай хавалася ружовае сонца, Адам гнаў дадому авечак, а сын бёг у вёску злоўленых злодзеяў Рабушкіных з почаўшымі ловамі: дзе пуды і 30 фунтаў пакрадзенага жыта на сваіх плечах і несьці злодзеі.

* * *

Пенк Значонак, вярнуўшыся позна з касьбы, даведаўся, што на полі ў снапох пачалі красьці калгасную пшаніцу і ячмень. Адам прыйшоў у праўленьне калгасу і папрасіў стрэльбу.

— Навошта табе?—запыталіся там.

— Пайду вартаваць снапы.

— У вас-жа ёсьць вартаўнік.

— Няхай сёньня пасьпіць ваш вартаўнік—сказаў Адам, вярнуў кажух і валёнкі пацяны, азарадамі, каб ніхто ня ўбачыў, падаўся ў поле.

Спусьцілася ноч і жалочным сьватлом месяца залію поле. Адам узяў колькі снапоў пшаніцы, адышоў у бок, лёг у разору і пакрыўся снапамі.

Сарабіцца пад месяцам іржышча. Ціха. Ужо поўнач і на сяле замоўкілі сабакі. Нехта паказаўся злодзяй. Ідзе проста на Адама, азіраючыся кожную хвіліну.

Вось ён ужо падышоў да пшаніцы. Калі ўпэўніўся, што вакол нікога няма, расьцягнуў на зямлі лейцы і пачаў класьці снапы. Паклаў, як падаць, завязаў і ўзяў на плечы.

— Стой! — крыкнуў Адам,—і зла віў чарговага злодзея.

І яшчэ жыве ночы сязеў Адам каля бабак. Злавіў адну вінаўку і двух жулікаў-злодзеяў. І толькі тады адаў стрэльбу вартаўніку і вярнуўся да сваёй работы...

* * *

Сядзіць Значонак Адам Вінцэсеў, калгасьнік 67 год, у прэзыдыуме першага ўсебеларускага зьезду калгасьнікаў-ударнікаў. Уважліва ловіць кожнае сказанае слова, часта вымае з бакавой кішэні запісную кніжку і запісвае тузы сваіх і далёкіх мыслі для справаздачы ў калгасе. А ў запісной кніжцы Адама лежыць прачытаныя сьпіс якіх-небудзь слоту бязбожнікаў, сьпіс вупражы, пастромкаў і лейцаў калгасу.

* * *

Значонак у 1917 годзе арганізоўвае на Заслаўшчыне бядняцкія камітэты, дзяліў панскую зямлю і сенажаці. Тады-ж парапшуў першы раз на жыцці пагаварыць з мясцовым папом.

— Хаваў у сябе попа афіцэраў. Меў зброю. Пропаведзі супроць бальшавікоў у царкве гаварыў. Э, думаю, галубчык, тут цяпер у маіх руках. Ары штаваў я папа і пасадзіў куды трэба.

Прайшло некалькі тыдняў і прышлі немцы. Выпусьцілі папа. Поп да немцаў—вазьмеце яго, Значонка. Забралі яны мяне і майго таварыша Янушкевіча—застрэлілі яго. А мяне лейкі белагвардзеец, як вытнуў ботам у жывот, дык я і памяці рашыўся. Аблілі вадой ды зноў біць пачалі. І цяпер ня чую на адно вуха. Калі ўдарыў у вуха, дык лопнула там нешта, крывёю абліўся. А другі падышоў ды бізуном, як секануў, дык праз дзве штаноў скуру расьсек і цяпер нашу яшчэ рубец. Забілі-б чаганы, дык батраві, дзякуй ім, выратавалі мяне.

Як пішлі немцы, я да свайго ворага, да папа. А ён заклінуўся ў хаце, ня пускае. Адчыні, кажу, сьвяты Распуцін, а то дзьверы выламыю. Калі ўварваліся мы ў хату, дык ён ужо богу душу аддаў—абрушыўся, гад, бацюся сустрэцца са мной вока ў вока.

Арганізаваў Адам потым лятэйку без босікнікаў. Упяцнуў у яе ўсё сяло і вычысьлі пастанову сходам—закрыць царкву.

— Званы завёз у Менск, на завод «Камунар». Іх было пяць—пяць фурманак патрэбна было ды яшчэ воз медзі наскроў у самой царкве, там попічыні такія медныя былі з надпісамі аб усякіх сьвятых.

Калі ехае Значонак па вуліцах Менску на машыне, то не без гонару прыпамінае сваім дэлегатам.

— А пацыпыпкі ў гэтай машыцы мабыць і мае—з тых звароў, што я на завод адвёз.

Адам Вінцэсеў пераспыняе на хвіліну гутарку і непакоіцца, ці дадуць яму слова ў спрочках.

— Хочацца мне расказаць дэлегатам аб усім сваім жыцьці і аб калгасе. А галоўнае—хочацца сказаць, каб сільней сьцерагілі калгаснае дабро ад злодзеяў і жулікаў.

— Калі я жыў на сваёй аднаасобнай гаспадарцы, то ніколі ў жыцьці больш не нажынаў, як 7 коп жыта. Бывала пасеем і выстанецца—шмат. Хочаш яго мялі, хлеб печы, хочаш стаў у куце і малося на яго, як на сьвятога.

Сям'я ў Адама была вялікая. Сем дачок і два сыны. Адзінаццаць чалавек трэба было накармі. І Адам з большымі дочкамі ішоў да кулакоў, працаваў, як ён гаворыць, за фунт гнілога бобу вялікі чэрвеньскі дзень.

— А зараз у мяне—жыцьцё! Сын у Чырвонай арміі шофэрам на танку ездзіць, другі камсамол—брыгадай кіруе, пяць дачок замуж аддаў, толькі адна—была камсамолкай—пачэрга. Цяпер, разумная дзеўка была. Яна, бачай, мяне з сынам і ў калгас зацягнула.

Хлеба ў Адама столькі, што і параўнаньня ніякага не падшукаеш.

— Я ўжо жыву заможна. Жыву ток, як ні жыў ні жыў сярэдняк у нашым сяле. Я хоць сам і стары, а ўсё-ж выпрацаваў 327 працадзён.

Перад тым, як пасхаць на зьезд і заняць месца за чырвоным сталом прэзыдыуму, Значонак купіў па рынку 50 пар пастромкаў і некалькі пудоў вяровак. І зараз з гонарам гаворыць аб гэтых пастромках.

— Пастромкі, паверыце, такія, што я падобных да іх ніколі ня бачыў.

Зараз сядзіць спакойны на зьездзе, бо ўсё зроблена і падрыхтавана да вясны. І гной вывезен, і насеньне ўсё ссыпана, і ачышчана, і коні добрыя, і вупрак і вучасткі за брыгадамі замацаваны.

— Падрыхтаваны мы так, што хоць заўтра можам выходзіць у поле.

І толькі крыху хвалюецца Адам Вінцэсеў, як успамінае, што яму трэба на зьездзе выступаць...

Заваюем высокі ўраджай
Рапарт калгасу „Новае жыцьцё", Слуцкага раёну

Першаму ўсебеларускаму зьезду калгасьнікаў-ударнікаў—лепшым байцом сацыялістычных палёў ад калгасьнікаў і калгасьніц калгасу «Новае жыцьцё»—шчырае калгаснае прывітаньне!

Мы, калгасьнікі і калгасьніцы с-г. арцелі «Новае жыцьцё», Іванаагародніцкага сельсавету, Слуцкага раёну, жадаем расказаць зьезду, як мы будуем калгас, як мы выконваем наказы нашага правадыра, першага калгасьніка-ударніка—тав. Сталіна.

Арганізаваўся наш калгас з 119 гаспадарак у 1929 годзе. Але не дагледзілі мы, як кулакі пралезьлі ў наша асяродзішча. А кулакі ня спалі. Яны разгарнулі шалёную работу. У выніку, ужо ўвесну ў поле выйшла сеяць толькі 11 гаспадарак. Мы не спалохаліся. Сваёй упартай работай паступова перакопвалі беднякоў і сераднякоў, што хісталіся.

У 1930 годзе да нас уступілі дзьве гаспадаркі, у 1931 годзе — ужо 61 гаспадарка. А ў 1932-33 г. г. 70 беднякоў і сераднякоў падалі заявы аб уступленьні ў калгасы, з якіх 41 ужо працуюць у калгасе, выканаўшы свае абавязкі і перад дзяржавай і перад калгасам. Да першай вясны другой пяцігодкі мы ідзем моцным атрядам 109 двароў.

Зямлі ў нас 780 гэктараў і даглядаем не добра, па-калгаснаму. Таму і ўраджай у нас з кожным годам павышаецца. У 1930 годзе мы сабралі з гэктара 6 цэнт. жыта і аўса, і 9 цэнт. пшаніцы. Праз год мы ўжо сабралі амаль 10 цэнт. ячменю, 5 цэнт. ільну і 120 цэнт. бульбы.

На 1933 год даем наша слова сабраць з аднаго гэктара на менш як 12 цэнт. збожжавых, 5 цэнт. ільну і 150 цэнт. бульбы.

Каб наша слова не засталося толькі словам, мы жыта пасеялі на гнаі і штучным угнаеньні, а пад ярыну зазяблілі ўсё поле. Вывезьлі 3.700 вазоў гною — 110 проц. пляну, 6 тон штучнага ўгнаеньня — 200 проц. пляну, закампаставалі 290 тон торфу і сабралі 31 цэнт. попелу — 300 проц. пляну. Насеньне ссыпана пэўтасьцю, з перавышэньнем на 20 проц. Страхавыя і кармавыя фонды таксама створаны. Насеньне добра асартавана, мы праверылі яго ўсехожасьць, паставілі надзейную варту і часта яе правяраем.

Коняй у нас 73. Даглядаем мы іх як сьлед: разьбілі на дзесяткі, кормім па нормах, чысьцім, падагналі збрую, набылі папоны, забраніявалі кармы на ўсю вясну, прымацавалі коняй да брыгад, а ў кожнай брыгадзе — да паасобных калгасьнікаў.

Інвэнтар і збруя ў спраўнасьці. Пробны выезд паказаў — хоць заўтра выходзь у поле.

Брыгады ў нас замацаваны яшчэ з мінулага году. Кожная брыгада ведае свой вучастак, адказвае за прымацаваных коняй, інвэнтар, збрую і машыны. Мы таксама арганізавалі ў кожнай брыгадзе бракерэжныя камісіі. Штотыдняёна праводзім у брыгадах вытворчыя нарады. Выбраны родкалегіі брыгадных штодзеннак на час сяўбы.

З году ў год мы маем рост пагалоўя жывёлы. Гадуем маладняк. Зараз у нас рагатай жывёлы 47 галоў, сьвіней дарослых — 46, маладняка—40 і авец — 26. Асабліва добрыя ў нас сьвіньні-матысы.

Цяпер пра наша будаўніцтва. На сёньняшні дзень мы набудавалі дзьве калгасныя стайні, кароўнік, сьвінарнік, два сьвірны, дзьве сілосныя ямы, два гумны, адну гародня-хавалыню, павець у 120 мэтраў для машын, кузьню, дзіцячыя асьлі і г. д. Пасадзілі сад у 5 гэкт.

Слуцкі раён церавыканаў пляны загатовак. Наш калгас таксама ішоў у першых радох. У 1930 годзе мы аслабаняліся ад загатовак. А ўжо ў 1931 годзе далі дзяржаве 192 цэнт. збожжа — 100 проц. пляну. У 1932 годзе мы здалі 265 цэнт.—130 проц. пляну, бульбы — 170 проц., ільнасемя — 18 цэнт. — 130 проц., ільнавалакна — 11 цэнт. — 101 проц., мяса — 1.135 кгр. — 101 проц. пляну, вывезьлі 150 кбм. лесу, 190 тон торфу і г. д.

Мы вярнулі дзяржаве ўсе да капейкі атрыманыя намі кредыты для гаспадаркі, поўнасьцю выплацілі абавязковыя плацяжы і набылі аблігацыі дзяржаўных пазык і акцыі трактарацэнтру.

Самі мы таксама добра забясьпечаны. Толькі аднаго збожжа мы атрымалі па 3 кгр. на адзін працадзень, ды яшчэ іншых культур і грашыма. Са сваіх даходаў калгасьнікі прадалі дзяржаве 3,5 тоны збожжа.

Ня дрэнна ў нас разгорнута масавая работа. У калгасе выпускаюцца насьценныя і радыё-газэты. Апроч пастаяннай ШКМ працуе вячэрняя школа калгаснай моладзі. Нашы камсамольцы — лепшыя ўдарнікі. Яны пад кіраўніцтвам партыйцаў на справе змагаюцца за ўмацаваньне калгаснай вытворчасьці. Нашы камуністы арганізавалі вакол партгрупы калгасны актыў. У кожнай брыгадзе працуюць партарганізатары і партыйныя агітатары, якімі кіруюць партгрупа калгасу і парт'ячэйка пры сельсавеце. Наш актыў змагаецца на толькі за ўмацаваньне свайго калгасу, але і аказвае значную дапамогу суседнім гаспадаркам.

Выконваючы ўказаньні тав. Сталіна, мы праверылі і ачысьцілі свае рады ад клясава-варожых элемэнтаў. З калгасу выкінуты два кулакі, адзін спекулянт і адзін заядлы гультай.

Злодзеяў, якія раскрадвалі наша калгаснае дабро, мы перадалі ў пралетарскі суд і ён сурова іх пакараў. Цяпер мы пільна ахоўваем калгасную маемасьць, устанавілі на ўсіх складах, стайнях і фэрмах надзейную варту. Апроч таго, 12 калгасьнікаў-ударнікаў у добраахвотным парадку па чарзе дапамагаюць вартаўніком.

Наш галоўны бой — гэта бой за бальшавіцкае правядзеньне весняной сяўбы.

— Барацьба за рэкордны ўраджай у Савецкай Беларусі і ва ўсёй нашай краіне; барацьба за бальшавіцкі калгас, за яго рост і ўмацаваньне, — вось лёзунг, за які будзе змагацца наш калгас «Новае жыцьцё», разам з усімі калгасьнікамі Случчыны, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, на чале з выпрабаваным бальшавіком тав. Гікало.

Даб'ем кулака, выгаім лодыр, зробім кожны калгас сапраўды бальшавіцкім, а кожнага калгасьніка — заможным!

Няхай жыве наша ленінская партыя і яе правадыр тав. Сталін!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б, на чале з тав. Гікало!

Няхай жывуць лепшыя байцы сацыялістычных палёў — калгасьнікі-ударнікі!

ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ.



ГУРБО—старшыня калгасу «Новае жыцьцё»

ДЭЛЕГАТ ЗЬЕЗДУ.

ГРАДАЎ У. — старшыня камуны «Чырвоны мэталіст», Гарадоцкага раёну.

А. Зарубежны, М. Пячорын, Б. Зеліксон

Рахунак Наркамлёгпраму БССР

«... Новае ў разьвіцьці нашай прамысловасьці заключаецца, між іншым, у тым, што мы маем цяпер магчымасьць разьвіваць паскораным тэмпам і цяжкую і лёгкую індустрыю».

(З прамовы тав. Сталіна на XVI зьезьдзе партыі).

Віцебск — адзін з буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР. Асноўныя прадукцыя, якая вырабляецца на віцебскіх фабрыках і заводах, — гэта прадметы шырокага ўжытку — абутак, гатовае адзеньне, панчохі і г. д. Гэта прадукцыя займае аллікую ўдзельную вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы БССР.

Аднак, у результаце неадэкватнай арганізацыі вытворчасьці, кіраўніцтва «пасоўу» з боку вышэйшых гаспадарчых арганізацый, адсутнасьці кантрэтнага штодзеннага кіраўніцтва сваіх фабрычных арганізацый, прамысловасьць Віцебшчыны, асабліва лёгкая, ужо доўгі час ня выходзіць з цярпіньню.

Возьмем буйнейшую ў БССР шэйную фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі». За 1932 год пры ўсіх умовах для поўнага выкананьня пляну фабрыкай недадана дзяржаве прадукцыі — гатовага адзеньня — на 14 мільёнаў рублёў пры перавыдатканьні фонду зарплаты на 600.000 руб. Прэміфікацыя быў выкананы толькі на 80 проц. Першыя месяцы 1933 году прарыў яшчэ больш пагнябілі. У студзені прэміфікацыя фабрыкай выкананы на 72,8 проц., а ў лютым усяго толькі на 67,3 проц. Такім чынам за студзень, люты і першую дэкаду сакавіка фабрыка зноў недадала дзяржаве прадукцыі на 2.059 тысяч рублёў.

Запытаеце любога адміністратара фабрыкі аб прычынах сыстэматычнага невыкананьня праграмы і вы заўсёды атрымаеце такі адказ: «Што-ж, у 1931 годзе наша фабрыка знаходзілася ў цяжкавым палажэньні, у 1932 годзе фабрыка рэканструявалася і цяпер зараз, у 1933 г., таксама адбываецца карэнная ломка ўсёй арганізацыі працы і г. д». Такой вось «аб'ектыўнымі» фабрычныя арганізацыі заўсёды прыкрываюцца, прыкрываюць свае няўменьне кіраваць у новай абстаноўцы.

На фабрыцы што ні квартал, то чарговая «перакулоўка». Разарамоўваюцца брыгады, рабочыя перакідваюцца з адной работы на другую. Ламаецца каляндэр, і загадчык цэхам, інструктары бягуць як звар'яцелыя, самі ня ведаючы, што ім рабіць.

А тымчасьцца гэта проста. Пераход на новы асартымэнт, як правіла, робіцца без усякай папярэдняй падрыхтоўкі, без належнага вывучэньня тэхналёгічных працэсаў, без падрыхтоўкі кадраў. Адным словам порабудова ідзе сапраўдным.

На фабрыку прыходзяць новыя рабочыя, большасьць якіх упершыню бачыць машыны. Многія рабочыя пачат на месяць трымаць у руках іголку, ці нагадзь, як абыходзіцца з машынамі. Між тым, тэхнічная прадасьвета, справа вывучэньня машын і прэсаў заклюцца на фабрыцы ў заняцьце. І ў результаце штаты з 760 машын зрыш 108 заўсёды знаходзяцца ў рамонце.

Сваёвольна фабрыкі пачынаюць бальшавізаваць, але ўсё ж бяды ў тым, што кіраўнікі абкомаўскіх камісіяў ідзеюць кіраўніцтва, пазбяжаюць, імкнуцца больш за ўсё «спатрэляць» іншых наездамі.

Амаль такі-ж малюнак і на другой, сёньня старой у БССР, шэйнай фабрыцы «Прафінтэрн».

За 1932 год фабрык недадала краіне розных польтаў 109.587 штук, што складае 1.718.400 руб., за студзень і люты 1933 году — 21.387 польтаў на суму 363.800 руб.

З таго-ж «посьпехам» выконваецца і якасная паказальніка. Брак заместаднаго процэнту даходзіць да трох. Асабліва вялікі брак прадукцыі ў цэху польтаў для доўчын. Былі выпадкі, калі са складу гатовых вырабаў пратуцыя займае вялікую ўдзельную вагу ва ўсёй народнай гаспадарцы БССР.

Аднак, у результаце неадэкватнай арганізацыі вытворчасьці, кіраўніцтва «пасоўу» з боку вышэйшых гаспадарчых арганізацый, адсутнасьці кантрэтнага штодзеннага кіраўніцтва сваіх фабрычных арганізацый, прамысловасьць Віцебшчыны, асабліва лёгкая, ужо доўгі час ня выходзіць з цярпіньню.

Возьмем буйнейшую ў БССР шэйную фабрыку «Сьцяг індустрыялізацыі». За 1932 год пры ўсіх умовах для поўнага выкананьня пляну фабрыкай недадана дзяржаве прадукцыі — гатовага адзеньня — на 14 мільёнаў рублёў пры перавыдатканьні фонду зарплаты на 600.000 руб. Прэміфікацыя быў выкананы толькі на 80 проц. Першыя месяцы 1933 году прарыў яшчэ больш пагнябілі. У студзені прэміфікацыя фабрыкай выкананы на 72,8 проц., а ў лютым усяго толькі на 67,3 проц. Такім чынам за студзень, люты і першую дэкаду сакавіка фабрыка зноў недадала дзяржаве прадукцыі на 2.059 тысяч рублёў.

Запытаеце любога адміністратара фабрыкі аб прычынах сыстэматычнага невыкананьня праграмы і вы заўсёды атрымаеце такі адказ: «Што-ж, у 1931 годзе наша фабрыка знаходзілася ў цяжкавым палажэньні, у 1932 годзе фабрыка рэканструявалася і цяпер зараз, у 1933 г., таксама адбываецца карэнная ломка ўсёй арганізацыі працы і г. д». Такой вось «аб'ектыўнымі» фабрычныя арганізацыі заўсёды прыкрываюцца, прыкрываюць свае няўменьне кіраваць у новай абстаноўцы.

На фабрыцы што ні квартал, то чарговая «перакулоўка». Разарамоўваюцца брыгады, рабочыя перакідваюцца з адной работы на другую. Ламаецца каляндэр, і загадчык цэхам, інструктары бягуць як звар'яцелыя, самі ня ведаючы, што ім рабіць.

А тымчасьцца гэта проста. Пераход на новы асартымэнт, як правіла, робіцца без усякай папярэдняй падрыхтоўкі, без належнага вывучэньня тэхналёгічных працэсаў, без падрыхтоўкі кадраў. Адным словам порабудова ідзе сапраўдным.

На фабрыку прыходзяць новыя рабочыя, большасьць якіх упершыню бачыць машыны. Многія рабочыя пачат на месяць трымаць у руках іголку, ці нагадзь, як абыходзіцца з машынамі. Між тым, тэхнічная прадасьвета, справа вывучэньня машын і прэсаў заклюцца на фабрыцы ў заняцьце. І ў результаце штаты з 760 машын зрыш 108 заўсёды знаходзяцца ў рамонце.

Сваёвольна фабрыкі пачынаюць бальшавізаваць, але ўсё ж бяды ў тым, што кіраўнікі абкомаўскіх камісіяў ідзеюць кіраўніцтва, пазбяжаюць, імкнуцца больш за ўсё «спатрэляць» іншых наездамі.

Панчошна - трыкатажная прамысловасьць Віцебшчыны таксама знаходзіцца ў глыбокім прарыве. **Панчошная фабрыка імя Клары Цэткін у мінулым годзе недавыпрацавала 280 тысяч дзесяткаў пар панчох на суму 2.787 тысяч рублёў.** Работу 1933 году фабрыка пачала з новымі прарывамі: **за студзень і люты зноў недадана краіне 279.245 дзесяткаў пар панчох на суму 249.344 рублёў.**

Асабліва заздаюць вытворчую праграму выпады (поўны брак) і ўгар, якія дасягнулі вялізарных памераў. **У мінулым годзе копьнасьць угару каш таксама фабрыцы каля 50 тысяч рублёў. Было перавыдатканьня зрыш 15 тон прадзіва.** Выпады таксама каштавалі фабрыцы больш за 10 тысяч руб.

Не палепшылася становішча і ў 1933 годзе. Выпады па плану яе павінны перавышаць 2,82 проц., а фактычна яны дасягнулі ў студзені 4,19 проц. Таксама і ўгару замест 1.75 проц. фактычна ёсьць 6 проц. **Студзеньскі процант угару ўжо каштаваў фабрыцы каля 10.000 рублёў. Зрыш 3-х тон прадзіва пайшло на вецер.**

Зрыўчэньнем праміфікацыі на лапчэйнай фабрыцы імя Клары Цэткін абкладаюцца простої людзей і машын. **За 1932 г. фабрыка напічвала 675.528 машынагадзін простою** або 8 проц. супроць усяго адпрацаванага часу (сюды не ўваходзяць 199.924 машынагадзін простою з-за адсутнасьці току).

У студзені і лютым 1933 году колькасьць простою яшчэ больш павялічылася. **Замест дапушчаных плянам 3 проц. простою, мы маем у студзені 23,36 проц. і ў лютым 13,45 проц. За студзень і люты па фабрыцы напічвалася 80.038 машынагадзін простою** (сюды таксама не ўваходзяць 42.270 машынагадзін простою з-за адсутнасьці току). Пасьля гэтага ня будзе дзівуцца, чаму ў мінулым годзе замест 9,7 проц. зьнижэньня сабекошту фабрыка дала толькі 1,12 проц. Пры такім становішчы, якое мы маем сёньня, таксама яна можа быць гутаркі аб зьнижэньні сабекошту.

Трэба адзначыць, што большы процант простою бывае з-за адсутнасьці прадзіва.

Але вельмі часта адсутнасьць прадзіва сьцьвярджэцца нічым іншым як самаспрэчнасьцю. Ёсьць факты, якія пацьвярджаюць, што хоць і ёсьць прадзіва, а машыны маюць простої. У вязальным цэху 14 лютага ў цэху «В» прастаялі 60 машын па 10 мінут кожная толькі з-за тых прычынаў, што загадчык зьмены Сенчанка не забясьпечыў сваячасовую падачу прадзіва у цэх.

Вялізарны разрыў складаецца паміж **матальным і вязальным цэхамі.** Справа ў тым, што матальны цэх пашыў атрымліваць 90 проц. прадзіва на кройц-пашулах, а фактычна яму дасылаюць амаль усё прэгніка у матках, што вязьме прадукцыйнасьць працы амаль на 50 процантаў (Роўтаўская і Краснапаляновая прадзільныя фабрыкі).

Значная доля простояў падае на рамонт машын. Машыны адпускаюцца яму заўсёды, задоўга. Чысьцяць іх рэдка. У матальным цэху [illegible] рацэн дусім дзяжна [illegible], за сваячасова прадасьцяцца [illegible], не вымяніць [illegible]. Рамонт машын, якога у большасьці [illegible] часта і недасканалы.

У гэтым годзе фабрыка імя Клары Цэткін падбіла бліскучэ вытворчае [illegible] ... [illegible] ... [illegible] ...

З лёхаў фашысцкіх катоўняў

Пісьменьнік Кіш апісвае катаваньні палітзьняволеных

ВЕНА, 22. Агенцтва «Рупаг» публікуе гутарку з вядомым пісьменьнікам Эгонам Эрвінам Кішам, які знаходзіцца ў Празе. Кіш, які знаходзіўся разам з 62 рабочымі ў турме берлінскага паліцэй-прэзыдыуму, пераведзены мі туды з фашысцкіх казармаў, — паведамляе, што ва ўсіх рабочых былі разьбіты пашбародкі і вырваны валасы. Іх падпальвалі сьвечкамі, на целе выпальвалі фашысцкую свастыку і білі па пазавых органах. Паводле паведамленьня Кіша, у фашысцкіх казармах чуюцца бесьперапынныя выстралы. Вясёлорэчна, там расстрэльваюць безьліч рабочых. Старшыня германскай «Лігі абароны правоў чалавека» Лемэн і рад выдатных пісьменьнікаў былі кінуты ў цёмную камэру і закаваны ў ланцугі. Як паведамляе агенцтва, ночу з 16 на 17 з фашысцкіх казармаў на Фрыдрыхштрасэ было вывезена 7 забітых, наконт якіх паліцыя адмаўляецца даць якія-небудзь давелкі. Старшыню с.-д. арганізацыі ў Крэйцбергу (раён Берліну) Герца прымусілі есьці конскі гной. Кіркуніх сацыял-дэмакратычнай арганізацыі Ведынга (рабочы раён Берліну), якога цягнулі з трэцяга паверху па каменных сходах, памёр ад ран.

Буржуазны аўстрыйскі друк публікуе падробязнае паведамленьне аб катаваньнях рэдактара мюнхенскага кансэрватыўнага каталіцкага журналу «Дэр Геральдэ Вэг», — Герліха. Паводле апошніх паведамленьняў, Герліх памёр.

БЭРЛІН, 22. Згодна паведамленьняў «Фосішэ цайтунг», адзін з арыштаваных у **Лобаў** камуністаў рабочы Бэгта забіт нацыянал-сацыялістамі, нібыта пры спробе ўцякаць. У мястэчку **Дыроц**, каля Берліну, некалькі асоб уварваліся ў кватэру камуністычнага рабочага Дрэшэра і цяжка паранілі яго. У прадмесьці **Эсэна** ўночы на 21-га дапаможны паліцэйскі застрэліў камуніста **Вэнцэля.**

Газэта працягвае прыводзіць паведамленьні аб арыштах камуністаў і бязупынных павальных вобысках.

Па вестках «Франфуртэр цэйтунг», у **Турыкгіі** за апошні тыдзень арыштавана больш за тысячу камуністычных актывістаў. У Ніжняй Сілезіі, паводле вестак Вольфа, за апошнія дні арыштавана каля 350 чалавек, з якіх 40 абвінавачваюцца ў дзяржаўнай здрадзе. У Вюнтэнбэргу зноў арыштован рад камуністычных і сацыял-дэмакратычных работнікаў, у тым ліку шмат выдатных прадстаўнікоў інтэлігенцыі.

Арыштаваныя за апошні тыдзень у Вюртэнбэргу камуністы пераведзены ў новы канцэнтрацыйны лягер, размешчаны ў Гейбэргу. З повада стварэньня канцэнтрацыйнага лягеру каля Дахау на 5 тысяч чалавек. «Берлінэр Цэйтунг» піша: «Нельга і думаць аб вызваленьні камуністычных актывістаў, бо пасобныя выпадкі паказалі ўжо, што яны, як толькі выходзяць на свабоду, зараз-жа зноў пачынаюць падрыўную работу».

У Любэку забаронены арганізацыі «жалезнага фронту» і фэйсбанэру.

У краіне Гейнэ нельга сьмяяцца

Забарона сатырычнай часопісі „Сымпліцысімус"

БЭРЛІН, 22. «Фосішэ цэйтунг» паведамляе, што кіраўнік паліцыі ў Вюртэнбэргу забараніў на неабмежаваны тэрмін пашырэньне вядомага сатырычнага штотыднёвіка «**Сымпліцысімус**». Орган баварскай народнай партыі «Франкішэ фольксблят», які выходзіць у Вюрцбургу, забаронен на 18 дзён.

Недапушчэньне прадстаўнікоў савецкага друку на адкрыцьцё рэйхстагу

БЭРЛІН, 22. Як вядома, прадстаўніком савецкага друку было адмоўлена ў білетах на ўрачыстае адкрыцьцё рэйхстагу ў Потсдаме. Пасьля таго, як з гэтага поваду паўпрадства СССР у Берліне заявіла пратест, прадстаўніку ТАСС быў выдан білет на адкрыцьцё рэйхстагу. Астатнім прадстаўніком савецкага друку білеты на адкрыцьцё рэйхстагу ня былі даны.

Амністыя для раней асуджаных гітлераўцаў

БЭРЛІН, 22. Паводле паведамленьня «Вольфа», Гіндэнбург падпісаў надзвычайны дэкрэт аб амністыі ўсім асуджаным за дзеяньні, учыненыя імі «ў барацьбе за ажыцьцяўленьне нацыянальнай ідэі». Адначасова з гэтым падпісан дэкрэт, які ўстанаўляе цяжкія кары за незаконнае нашэньне формы і знакоў нацыянальных арганізацый, а таксама за «распаўсюджаньне няправільных цьверджаньняў», якія наносяць шкоду аўтарытэту агульна-германскага ўраду або ўрадам пасобных германскіх дзяржаў і аб'яднаньняў, якія за імі стаяць.

Зьмена рэгляманту рэйхстагу

Кворум заўсёды забясьпечан

БЭРЛІН, 22. Сёньня адбылося першае пасяджэньне камісіі рэйхстагу па пытаньнях рэгляманту. Пераданае ўчора ў камісію патрабаваньне сацыял-дэмакратычнай фракцыі аб вызваленьні арыштаваных сацыял-дэмакратычных дэпутатаў рэйхстагу было адхілена 15 галасамі нацыянал-сацыялістаў супроць 6 галасоў сацыял-дэмакратаў пры ўстрымаўшыхся прадстаўнікох партыі цэнтру і баварскай народнай партыі. Прадстаўнікі партыі нацыяналістаў на пасяджэньні ня прысутнічалі.

Потым камісія перайшла да абмеркаваньня ўнесенага ўрадавымі партыямі праекту зьмены рэгляманту рэйхстагу. Найбольш істотным пунктам гэтага праекту зьяўляецца пункт, што прадугледжвае выключэньне на тэрмін да 60 пасяджэньняў кожнага дэпутата, які «без уважлівых прычын» прапусьціць хоць-бы адно пасяджэньне. Улічваючы, што ў далейшым рэйхстаг будзе зьбірацца вельмі рэдка і на вельмі кароткія сесіі, гэты пункт фактычна зводзіцца да выключэньня данага дэпутата на ўвесь час работ цяперашняга рэйхстагу. Адначасова праект зьмяшчае пункт, згодна якога выключаныя на аснове вышэйпамянёнага палажэньня дэпутаты фармальна лічацца прысутнымі на пасяджэньні. Гэты пункт азначае, што незалежна ад колькасьці выключаных дэпутатаў заўсёды будзе ў наяўнасьці патрэбны па канстытуцыі кворум.

Прапанаваны праект быў прынят галасамі нацыянал-сацыялістаў, цэнтру і баварскай народнай партыі, супроць са цыял-дэмакратаў.

Адкрыцьцё прускага ляндтагу

БЭРЛІН, 22. Адкрыўся ляндтаг Прусіі. Старшыня фракцыі нацыянал-сацыялісцкай партыі КУБЭ ў праграмнай прамове заявіў, што асноўная задача ляндтагу — агнём і мячом пакончыць з камунізмам і з «мэтадамі лістападаўскай рэвалюцыі». Маючы на ўвазе партыю цэнтру, Кубэ ўказаў, што калі асобнай партыі і даецца месца ў прэзыдыуме ляндтагу, з гэтага яшчэ далёка ня вынікае, што ёй будуць зроблены далейшыя ўступкі.

Старшыня фракцыі нацыяналістаў Вінторфэльд заключыў прамову выказам надзеі, што «прыйдзе час — і над Прусіяй будзе ўзьвіцца сьцяг гогенцолернаў».

Старшынёй ляндтагу перавыбран нацыянал-сацыяліст Керль. За яго галасавалі ўсе партыі, апрача сацыял-дэмакратаў, якія ўстрымаліся. Потым па прапанове нацыянал-сацыялістаў ляндтаг усімі галасамі, апрача сацыял-дэмакратаў, прыняў рашэньне аб значным пашырэньні паўнамоцтваў прэзыдэнта ляндтагу і аб абавязковай прысутнасьці членаў ляндтагу на пасяджэньнях.

Хто фінансаваў Гітлера?

«Дзеньнік Віленскі» піша, што гэтымі днямі ў Брэмэне распачнецца сэнсацыйны суд над братамі Ляўсэн, якія зьяўляюцца кіраўнікамі найбуйнейшых у Германіі ткацкіх фабрык. У гэтых фабрыках працуе каля 25 тыс. рабочых і даюць яны 20 млн. кгр. прадукцыі ў год.

Гэта магутнае прадпрыемства ў 1931 годзе абвясьціла банкруцтва, пацягнуўшае за сабой крах Данат-банку, якому браты Ляўсэн былі вінаваты 76 млн. марак.

СЭНСАЦЫЯНАСЬЦЬ ГЭТАГА ПРАЦЭСУ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ ФАКЦЕ, ШТО БРАТЫ ЛЯУСЭН, ЯКІЯ ЗЬЯЎЛЯЮЦА ЧЛЕНАМІ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСЦКАЙ ПАРТЫІ, ФІНАНСАВАЛІ ГІТЛЕРА.

ДЫРЭКТАРЫЯТ ЧАТЫРОХ ДЗЯРЖАЎ

Плян Мусаліні-Макданальда

ЛЁНДАН, 21 сакавіка. Лёнданскі друк на аснове паведамленьняў з францускіх крыніц выкладае зьмест спраектаванага ў Рыме пакту наступным чынам: 1) Адмаўленьне ад ужываньня сілы і абавязацельства захаваць мір у Эўропе (гэты пункт матывуецца тым, што пасьля адыходу Японіі пастаяннымі членамі рады Лігі нацый застаюцца 4 галоўныя эўрапейскія дзяржавы); 2) канвэнцыя аб пакце заключаецца на 10 год з аўтаматычным працягам тэрміну да таго часу, пакуль ня будзе заяўлена з чыйго-небудзь боку аб адмаўленьні ад пакту (у гэтым выпадку пакт траціць сілу праз год пасьля паступленьня адпаведнай заявы); 3) далучэньне да дагавору адкрыта для ўсіх дзяржаў; 4) у адпаведнасьці са статутам Лігі нацый, пытаньне аб перагледзе мірных дагавораў можа быць пастаўлена пры вядомых абставінах; 5) Англія, Францыя і Італія заяўляюць, што ў сьнежні мінулага году было прызнана ў прынцыпе, што Германія атрымлівае роўнаасьць правоў і што яны маюць намер адшукаць у згодзе паміж сабою спосабы практычнага ажыцьцяўленьня гэтага прызнаньня. У выпадку прыняцьця канвэнцыі канфэрэнцыяй па раззбраеньні, Германія згаджаецца праводзіць у адносінах сваіх узброеных сіл мерапрыемствы, прынятыя ў гэтай канвэнцыі. Тое самае будзе адносіцца да Аўстрыі, Вэнгрыі і Баўгарыі; 6) чатыры дзяржавы будуць старацца весьці агульную лінію палітыкі па-за Эўропай і ў калініяльных пытаньнях. Гэты пункт тлумачыцца, як указаньне на магчымасьць перагразьмеркаваньня мандатаў. Апошні пункт гаворыць аб ратыфікацыі пакту парлямантамі чатырох краін і аб перадачы яго на кваньне Лізе нацый.

Польшча ў агні забастовачных баёў

Барацьба да перамогі

Пастанова канфэрэнцыі лодзінскіх тэкстыльшчыкаў

ВАРШАВА, 22. Гераічная забастоўка тэкстыльшчыкаў Лодзінскага раёну сустракае шырокі водгук сярод працоўных усёй краіны. Учора ў Лодзі адбылася канфэрэнцыя прафсаюзных і фабрычных дэлегатаў. У канфэрэнцыі прымалі ўдзел прадстаўнікі прафсаюзаў. **Аднагалосна была прынята рэзалюцыя абвясьціць з заўтрашняга дня дэманстрацыйную ўсеагульную забастоўку ў Лодзінскім раёне.** У рэзалюцыі падкрэсьлівецца, што ў выпадку, **калі аднадзенная забастоўка ня прымусіць прадпрыемцаў і ўраду задаволіць патрабаваньні бастуючых, дык усеагульная забастоўка пратэсту выльлецца ў працяжную забастоўку.**

Учора ў **Пабіяніцах** зноў адбыліся бурныя сутычкі паліцыі з рабочымі. Шматлікія групы бастуючых тэкстыльшчыкаў наладзілі паход з Лодзі ў Пабіяніцы, каб прыняць удзел у пахаваньні забітых паліцыяй 5 рабочых. **У паходзе прымала ўдзел звыш 7.000 чалавек.** У часе паходу дэманстранты сьпявалі раралюцыйныя песьні і агалашалі рэвалюцыйныя лёзунгі. На мітынгах і масоўках тэкстыльшчыкаў у Лодзі распаўсюджваюцца камуністычныя лістоўкі, якія заклікаюць рабочых да бязьлітаснай барацьбы са шпрэйкбрэхэрамі і да ўсеагульнай палітычнай забастоўкі супроць фашысцкага тэрору і наступленьня капіталу.

* * *

Беластоцкія тэкстыльшчыкі, якія абвясьцілі ў адзнаку салідарнасьці з лодзінскімі тэкстыльшчыкамі ўсеагульную забастоўку, патрабуюць павялічэньня зарплаты да ўзроўню 1928 году. Бастуе каля 1.800 чал.

* * *

Забастоўка гарнякоў Дамброўскага раёну працягваецца. Бастуючыя затаюцца пад зямлёй.

Сойм зацьвердзіў дэкрэт аб надзвычайных паўнамоцтвах для прэзыдэнта

Камдэпутат Рожэк не атрымаў слова

ВАРШАВА, 22. Урадавая большасьць соўму зацьвердзіла дэкрэт аб наданьні надзвычайных паўнамоцтваў прэзыдэнту Польшчы. Пэпэсэсаўцы, эндэкі, украінскі клюб і іншыя «апазыцыйныя» групы дэманстрацыйна пакінулі залю пасяджэньняў і ў абмеркаваньні пытаньня аб надзвычайных паўнамоцтвах удзелу ня прымалі. Дакладчык па гэтым пытаньні дэпутат беспартыйнага блёку (пілсудчык) Пасхальскі заявіў ад імя юрыдычнай камісіі сойму, што прапанаваны закон перш за ўсё «акт памінучай празорлівасьці». «Падзеі апошняга часу на абедзьвюх паўкулях сьвету, — заявіў Пасхальскі, — пераконваюць, што ніякіх заўваг нават апазыцыя зрабіць ня можа». Пры гэтым ён спасылаўся на аналёгічныя законы ў Германіі, ПАЗШ і Аўстрыі. Прэм'ер Прыстар заявіў, што паданьне шырокіх паўнамоцтваў прэзыдэнту дапаможа ўраду ў барацьбе з труднасьцямі і дасьць магчымасьць «закончыць рад работ, распачатых у розных галінах».

Пераходзячы да пытаньняў замежнай палітыкі, Прыстар заявіў: «Зразумела, нядобра, калі ў той момант, як мы заняты работай, хтосьці за сьцяною робіць шум. Нядобра, калі мы чуем водгукі ўзрушэньняў нават здалёк, напрыклад, водгукі, якія даносяцца да нас з-за Атлянтычнага акіяну. Гэта, аднак, не павінна адцягваць нас ад тых мэтаў, якія мы сабе паставілі, і ад работ, якія намі пачаты». Старшыня беспартыйнага блёку дэпутат Славэк запаўніў урад, што ўрадавы блёк з поўным давер'ем і разуменьнем выказваецца за зацьверджаньне закону аб паўнамоцтвах.

Дэпутат Рожэк, які патрабаваў слова ад імя камфракцыі сойму, слова не атрымаў, бо старшыня сойму тутжа прагаласаваў прапанову аб спыненьні спрэчак.

ЗАБАСТОЎКА ШАЎЦОЎ У ВІЛЬНІ АБВАСТРАЕЦЦА

ВІЛЬНЯ, 22. Як піша «Кур'ер Віленскі», забастоўка шаўцоў у Вільні, якая цягнецца ўжо некалькі дзён, у апошнія часы вельмі абвастрылася. Да забастоўкі далучыліся ўсе шаўцы, якія яшчэ працавалі. Бастуе каля 1.500 шаўцоў.

Ёсьць чуткі, што работадацелі згаджаюцца павысіць заробкі на 50 грошай у дзень (50 грошай = 11 капейкам). На такое мінімальнае павышэньне бастуючыя не згаджаюцца.

Сёньня ў спэцыяльна занятым памяшканьні на Дамініканскай вуліцы адбудзецца агульны сход усіх шаўцоў бяз розьніцы прафсаюзнай прыналежнасьці. На гэтым сходзе мае быць абгаворана сучаснае становішча і далейшыя дзеяньні. З настрояў, якія пануюць сярод бастуючых, можна прадугледжваць, што забастоўка будзе цягнуцца да поўнай перамогі.

Прамыслоўцы хочуць затапіць бастуючыя капальні

Як падаюць польскія газэты, прамыслоўцы маюць намер затапіць капальні, дзе абвешчана забастоўка. Урад будзе процідзейнічаць гэтаму замеру прамыслоўцаў.

(Уласн. інф.).

БУРНЫЯ СТУДЭНЦКІЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ

Польскія газэты падаюць рад вестак аб дэманстрацыі студэнтаў у розных гарадох Польшчы. Гэтыя дэманстрацыі накіраваны супроць новага закону аб вышэйшых школах, які скасоўвае аўтаномію гэтых школ.

Вось як апісвае такую дэманстрацыю «Дзеньнік Віленскі»: «У **Варшаве** ў вэстыбюлі галоўнага будынку унівэрсытэту адбыўся студэнцкі мітынг, у якім прымала ўдзел некалькі сот чалавек. Мітынг скончыўся воклічамі: «Няхай жыве аўтаномія вышэйшых школ!» Пасьля мітынгу студэнты наладзілі дэманстрацыю на вуліцы Кракаўскае прадмесьце. Дэманстрацыю разагнала паліцыя пры дапамозе пажарнай каманды, якая дэманстрантаў аблівала сьцюдзёнай вадой».

(Уласн. інф.).

ЗНОЎ ЯЎРЭЙСКІЯ ПАГРОМЫ

У **Граеві** (каля Беластоку) і ў **Калішу** фашысты арганізавалі яўрэйскія пагромы. У многіх яўрэйскіх магазынах выбіты шыбы.

Канфэрэнцыя па раззбраеньні зноў адтэрмінавана

ЖЭНЭВА, 22. Адтэрмінаваньне канфэрэнцыі па раззбраеньні на доўгі час у сувязі з вялікаднымі канікуламі (называюць дату 24 красавіка) лічыцца прадвызначаным апублікаваньнем учарайшняга камюнікэ пасьля пасяджэньня прэзыдыуму бюро канфэрэнцыі. Канфэрэнцыя адтэрмінавана па ініцыятыве ангельскай дэлегацыі. Пастанова прэзыдыуму была прынята пасьля тэлефоннай гутаркі Гендэрсона з Саймонам, які знаходзіцца ў Парыжы. Указваюць, што брытанская дэлегацыя мае намер скарыстаць перапынак, каб дабіцца кампромісу паміж 4-мя вялікімі эўрапэйскімі дзяржавамі на аснове рымскіх перагавораў Макданальда і Мусаліні.

Аб рэдакцыі газэты „Сельгаспрабочы Беларусі"

Пастанова парткалегіі ЦКК КП(б)Б ад 7 лютага 1933 г.

Заслухаўшы даклад камісіі ЦК і ЦКК, парткалегія ЦКК КП(б)Б адзначае:

Рэдакцыя газэты «Сельска-гаспадарчы рабочы Беларусі» не арганізавала настойлівай і пасьлядоўнай барацьбы за поўнае і своячасовае выкананьне плянаў усіх відаў загатовак па саўгасах («Бязьдзежавічы», «Баконь», «Каменка», «Сьляпянка», «Веснава» і г. д.) і МТС (Крупскай, Чашніцкай, Расонскай, Сураскай і г. д.), па-бальшавіцку не змагалася супроць буржуазных перагаджэнцаў, патураючых сабатажу загатовак, супроць элемэнтаў, якія сваю контр-рэвалюцыйную работу прыкрываюць фальшыва - нацыянальным сьцягам.

Рэдакцыя не вяла разгорнутай барацьбы з буржуазна-месьніцкімі тэндэнцыямі раду саўгасу («Рачневічы», «Пятроліна» і інш.), з разбазарваньнем і раскрадваньнем грамадзкай і дзяржаўнай маемасьці (саўгас імя Капініна, «Дабрынь» і г. д.).

Газэта «Сельска-гаспадарчы рабочы Беларусі» зусім невыстарчальна змагалася за арганізацыйнае і палітычнае ўмацаваньне калгасаў, саўгасаў і МТС, за сацыялістычнае перавыхаваньне новых рабочых і калгаснікаў, за ўкараненьне ў шырокія масы рабочых і калгаснікаў, сацыялістычных мэтадаў работы.

Апошнясьць цьвёрдага бальшавіцкага кіраўніцтва газэтай з боку рэдактара тав. Хацановіча і ЦП прафсаюзу МТС, жывёлагадоўчых і збожжавых саўгасаў, органам і выданьнем якіх зьяўляецца газэта, спрыяла засьмечанасьці класава-варожымі элемэнтамі (у прыватнасьці, былым актыўным меншавіком Гольдзіным), бытавому разлажэньню апарату рэдакцыі.

Парткалегія ЦКК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Рэдактар тав. Хацановіч, член партыі з 1924 г., партбілет № 0805123, па сацыяльным паходжаньні сялянін, за страту клясавай пільнасьці, за неарганізацыю бальшавіцкай барацьбы з кулацкім сабатажам у загатоўках і з буржуазна-месьніцкімі тэндэнцыямі раду саўгасаў, за дапушчэньне бытавога разлажэньня і засьмечанасьці апарату рэдакцыі і за ўдзел у папойцы з чужымі элемэнтамі заслугоўвае выключэньня з партыі. Аднак, прымаючы пад увагу поўнае прызнаньне т. Хацановічам усіх дапушчаных ім грубых палітычных памылак і тое, што ён за 8 год знаходжаньня ў партыі на меў партыйных спагнаньняў, — абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем, зьняць з работы ў рэдакцыі і паслаць яго на нізавую работу, з забаронай на працягу 2-х год работу ў друку.

2. Загадчыка апэрацыйна - масавага сэктару газэты Шэада, кандыдата партыі з 1931 году, члена ЛКСМБ з 1926 году, па сацыяльным становішчы батрак, які ўжо прыцягваўся да партдаказнасьці і не апраўдаў давер'я партыі, за страту клясавай пільнасьці, за адсутнасьць з яго боку барацьбы з кулацкім сабатажам у загатоўках і буржуазна-месьніцкімі тэндэнцыямі раду саўгасаў, за ўдзел у папойцы, за ліберальныя адносіны да контр-рэвалюцыйных анэкдотаў і замоўчваньне сапраўднага стану апарату рэдакцыі, — выключыць з кандыдатаў партыі, зьняць з работы ў рэдакцыі і забараніць работу ў друку.

3. Карпусенку — члена партыі з 1927 г., партбілет № 1102418, па сацыяльным паходжаньні сялянін, б. член прэзыдыуму ЦП саюзу вылёлагадоўчых саўгасаў, за распаўсюджваньне контр-рэвалюцыйных анэкдотаў і садзейнасьць разлажэньню апарату рэдакцыі, — выключыць з партыі і зьняць з адказнай работы.

4. Старшыням ЦП прафсаюзаў МТС, жывёлагадоўчых і збожжавых саўгасаў т. т. Падвойскаму, Краўчанка і Мелярэвічу, а таксама бюро партыйнай ячэйкі рэдакцыі «Калгаснік Беларусі» (ячэйка аб'яднана з рэдакцыяй газэты «Сельска-гаспадарчы рабочы Беларусі») за ненадпаджаньне апэрацыйнага кіраўніцтва газэтай і нерэагаваньне на хваравітыя зьявішчы, якія былі ў рэдакцыі, — абвясьціць вымову.

5. Перадаць на разгляд ЦК ЛКСМБ справу членаў ЛКСМБ Гайшуна, Дашкевіча і Проніка, як удзельнікаў у папойцы і разлажэньнях. Неадкладна зьняць іх з работы ў рэдакцыі і забараніць працаваць у друку.

6. Справу аб члене ЛКСМБ т. Русовічу, які ведаў аб папойцы і не сьцягнізаваў аб гэтым вышэйшым органам, — перадаць на разгляд ЦК ЛКСМБ.

7. Прыняць да ведама паведамленьне аб тым, што Культпропам ЦК КП(б)Б распрацоўваецца пытаньне аб рэарганізацыі газэты.

Сакратар парткалегіі ЦКК КП(б)Б
СУХАНАВА.

Летнія лягеры для піанэраў і школьнікаў

МенгарАНА, інспэкцыя аховы здароўя і ЦБ юных піанэраў распрацавалі плян абслугоўваньня піанэраў і школьнікаў летнімі лягерамі ў 1933 г.

Будзе арганізавана і абсталявана баз—у Астрашыцкім Гарадку, Смалявіцкім раёне, у Дукорах і г. д. Усяго за 1933 г. будзе прапушчана праз летнія лягеры 6.000 піанэраў і школьнікаў Менску. Для гэтай мэты адпушчана 250 тыс. руб.

Хроніка

На 103,2 проц. выкананы плян мабілізацыі сродкаў першага кварталу Слуцкі раён.

Камісія па веснавой санітарнай ачыстцы гораду створана пры Менгарсавеце. На санітарныя мерапрыемствы адпушчана 10.000 руб.

Гарсавет даручыў тав. Кавалёву безадкладна заняцца пытаньнем пра паляпшэньне работы менскіх гасьцініц, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падбор работнікаў. Склікаецца спэцыяльная нарада работнікаў гасьцініц, на якой будуць вызначаны канкретныя мерапрыемствы.

200 пешых камсамольцаў мабілізаваў Віцебскі гарком на пастаянную работу ў вёсцы.

Пяць брыгад для рамонту абутку калгасьнікаў накіравала ў сельсаветы віцебская арцель «Каапрамонт».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ-1)
Маст кіраўн. ЛІТВІНАЎ-Л. І П. ТУР.
СЁНЬНЯ
ЗЯМЛЯ І НЕБА
п'еса ў 4-х дзеях.
Пачатак у 8 г.
„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" КАСА—ад 1 г. дня
НАЕЗЬНІК з УАЙ ЛЬД-ВЭСТА 2 серыі ў адзін сэанс.
Дзіцячы кукавы КІНО-ТЭАТР Каса з 12 г. дня.
З 23 сакавіка Гукавы фільм у 6 част. АДБІТАК ЧАСУ
ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ Каса—ад 12 г. дня
Мастацкі фільм ДАЧКА РАФКЭ
ПРАЛЕТАРЫ
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ ЧУЖАЯ Драма ў 6 ч.
„СПАРТАК" КАСА—ад 1 г. дня
Мастацкі фільм СЬВЯТА ЎЧІРЫ Кіно п'еса ў 5 частках

НАВУЧАЛЬНЫ КАМБІНАТ „СОЮЗОРГУЧЕТА"
ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, ШТО ІМ
з 25 сакавіка г. г.
арганізуецца група рахункаводаў
для сыстэмы „САЮЗДРУК"
і група ст. БУХГАЛЬТАРАЎ
для сыстэмы ЗАГАТНЫВЁЛА.
У групу ст. БУХГАЛЬТАРАЎ прымаюцца бух. і пам. бух. са стажам работы па двайной бухгальтэрыі ня менш двух год.
У групу рахункаводаў—з адукацыяй ня менш сямігодкі.
Стыпэндыя курсантам устанаўліваецца:
Гр. ст. бухгальтараў ад 100 да 125 р.
„ рахункаводаў „ 60 да 100 р.
Апрача гэтага 25 руб. натэрных.
Інтэрнатам курсанты не забясьпечваюцца.
Пасьля скончаньні курсанты павінны прапрацаваць у вышэйпаказаных сыстэмах ня менш двух год.
Курсанты прымаюцца да сталоўні.
Заявы з далучэньнем дакумантаў: аб сац. становішчы, сац. паходжаньні, аб рабоце бух. ці пошбухам на конец двух год (для гр. ст. бухг.), аб адукацыі ня ніжэй сямігодкі, аб узросьце і адносінах да вайсковай павінасьці (для мужчын), аб працоўным стажы і даведку адміністрацыі аб аслабленьні з апошняга месца працы або вучобы накіраваць па адрасу: Менск, Міхайлаўская 1-4, 3-я школа, навучальнаму камбінату „СОЮЗОРГУЧЕТ".
Пры непрадстаўленьні ўсіх пералічаных дакумантаў заявы разглядацца ня будуць.
Эрмін падачы заяў да 1-га красавіка.
Аб дні пачатку вучобы будзе паведамлена кожнаму залічанаму паведамленьнем на дом.
Навуч. К-т „СОЮЗОРГУЧЕТА".

Рабфак пры БДУ з 1-га красавіка 1933 г.
АДКРЫВАЕ ПРЫЁМ
на скарочаны (5-месячны)
IV курс Рабфаку, з аддзяленьнямі: агульным, яўрэйскім і польскім.
Закончыўшыя залічваюцца студэнтамі БДУ, або яўрэйскага ці польскага інстытуту.
Прымаюцца рабочыя, дзеці рабочых і калгаснікі, якія маюць адукацыю ня ніжэй 8-мі груп 10-цігодкі, або адпаведных груп вячэрніх рабочых школ і школ фабзавучу, ва ўзросьце ня менш 17 год. Залічаныя забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам.
Да заявы трэба дадаць наступныя дакументы: анкета (заверэная), спраўка аб сац становішчы, аб адукацыі, спраўка аб нараджэньні, аб здароўі, характарыстыка з месца працы.
Прыём заяў да 1 красавіка
ў канцылярыі Рабфаку БДУ ад 10 да 14 і ад 18 да 22 гадз., галоўны корпус БДУ, 3 паверх, пакой № 305.
Пачатак заняткаў з 1 красавіка 1933 г.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ТОРГСІН
ГЭТЫМІ ДНЯМІ, АКРАМЯ ІСНУЮЧЫХ МАГАЗЫНАЎ.
АДКРЫВАЕ
НАСТУПНЫЯ МАГАЗЫНЫ:
1. ЛЕНІНСКАЯ, 10.
ПА ПРОДАЖЫ:
мясо, рыба-кончэрваў, фэрштаў, малочных прадуктаў і гародніны
2. САВЕЦКАЯ, 24, Дом Мяталіст.
Універмаг— поўны асэрты мэнт усіх тавараў.
3. САВЕЦКАЯ, 127.
Бакалейна-гастрэнамічны.
4. КАМУНАЛЬНАЯ, 31.
Універмаг— поўны асэртымэнт усіх тавараў.
АКРАМЯ ГЭТАГА
АДКРЫВАЮЦЦА НОВЫЯ СКУПАЧНЫЯ ПУНКТЫ
ПА ПРЫЁМЦЫ
СРЭБРА і ЗОЛАТА:
1. Школьная, 2-1. 2. Савецкая, 80. 3. Савецкая, 24 4. Савецкая, 127.
ТОРГСІН.

У АДДЗЕЛ абвестак ЗВАНЕЦЕ па тэлефону № 21-358.

ДА ВЕДАМА ДЭЛЕГАТАЎ Усебеларускага зьезду калгаснікаў-ударнікаў!
ДЗЯРЖАЎНЫМ ВЫДАВЕЦТВАМ БЕЛАРУСІ (ДВБ), БЕЛ. АДДЗЯЛЕНЬНЕМ КОГІЗ'а РСФСР і БАКТ'ам
НА ЗЬЕЗЬДЗЕ адкрыта
ВЫСТАЎКА СЕЛЬГАСЛІТАРАТУРЫ
па ўсіх пытаньнях агратэхніці і калгаснага будаўніцтва.
НА БЕЛАРУСКАЙ, РУСКАЙ і ІНШЫХ МОВАХ НАЦМЕНШАСЬЦЯЙ БССР
ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ:
КНІЖНЫ КІЁСК з продажаю на месцы літ-ры сельска-гаспадарчай, сацыяльна-эканамічнай, па бягучай палітыцы, мастацкай, юнацка-дзіцячай і іншай—на беларускай, рускай і іншых мовах нацменшасьцей БССР.
ПРЫЁМ ЗАКАЗАЎ на літаратуру з адпраўкаю на месцы накладной платаю.
КНІЖНАЯ КАНСУЛЬТАЦЫЯ і даведкі.

У выданай ДВБ брашуры
Л. М. Кагановіч—„Умацаваньне калгасаў і задачы веснавой сяўбы (даклад на першым усесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў 16 лютага 1933 г.) укралася грубая памылка: на стар. 10, радок 14 зьнізу, надрукавана: „Што ўзбуйненьне сельскай гаспадаркі немагчыма, гэта ясна кожнаму". Трэба чыта ць: „Што узбуйненьне сельскай гаспадаркі немінуча, гэта ясна кожнаму".

Жлобінская школа ФЗН птушкапрамысловасьці
АБВЯШЧАЕ
ВЕСНАВЫ НАБОР
ВУЧНЯЎ У ШКОЛУ.
Прымаюцца: рабочыя і іх дзеці, калгаснікі, саматужнікі, служачыя і сялянскія асобнікі (беднякі-малазямныя сераднякі) ва ўзросьце ад 16 да 19 год з адукацыяй 6 і 7 груп сямігодкі.
Дакументы прадстаўляюцца, згодна існуючых правіл.
Усе залічаныя забясьпечваюцца інтэрнатам і стыпэндыяй у разьмерах ад 35 да 62 руб. у месяц.
Заявы прымаюцца да 1 красавіка.
Паштовы адрас: г. Жлобін, Птушкавакомбінат ФЗН.
Пачатак заняткаў 5 красавіка.
Заг. ФЗН ЖАКОВІЧ.

Згодна пастановы Чэрыкаўскага РВК
ЧЭРЫКАЎСКІ КАМБІНАТ
з 10-III—1933 г.
ЛІКВІДУЕЦЦА.
усе операцыі па камбінату будуць праводзіцца да 1-IV—33 г.
Ліквідацыйная камісія.

УСІМ загадчыкам АНА і старшыням саюзу асьветы
ПРАПАНУЕМ
да пятага красавіка правесьці
гарадзкія раённыя зьлёты асьветнікаў
ПА ПЫТАНЬНІ
ВЫНІКАЎ САКАВІЦКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ПАСТАНОВЫ ЦК АБ РАБОЦЕ НАРКАМАСЬВЕТЫ.
ЗЬЛЁТЫ МАБІЛІЗУЮЦЬ на:
а) рашучую барацьбу за асноўныя прынцыпы і інтэрнацыяналізму ў нацыянальна-культурным будаўніцтве, супроць буржуазна-кулацкіх нацыяналістычных тэндэнцый;
б) поўны ахоп усенавучам малапісьменных і рэшта пяпісьменных;
в) недапушчэньне адсеву са школ вучняў;
г) 100 проц. выкананьне пляну арганізацыі школьных, дашкольных курсаў, вярбовак асьветнікаў у заочныя установы;
д) разгортваньне дашкольных установаў, рашучая перабудова работы дамоў сацкультуры ў адпаведнасьці з задачамі пасеўнай;
е) поўнае выкананьне пастаноў партыі і ўраду аб матар'яльным забясьпячэньні асьветнікаў;
ж) карэнне паляпшэньне якасьці работы культасьветных установаў, разгортваньне палітэкізацыі на аснове сацсаборніцтва і ўдарніцтва.
Вынікі зьлёту шлеце дзесятага красавіка ў НКА і ЦП саюзу
Нарком Асьветы ЧАРНУШЭВІЧ.
За старшыню ЦП Працоўсьветы ЗАРАЖЭВУСКІ.

ВЫДАВЕЦТВУ „ЗЬВЯЗДА" ПАТРЭБНА КАНТОРШЧЫЦА
Зварачацца: Савецкая 63, 2-й паверх.

Партыйная і камсамольская арганізацыі, дырэкцыя, МК і прафком канцэрторы і мастацкіх музэяў з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай сьмерці настаўніка-вакаліста Бел. Дзярж. канцэрторы і мастацкіму БАНАЧЫЧА АНТОНА ПЯТРОВІЧА і выказваюць спачуваньне сям'і нябожчыка.

Беларуская фабрыка Мэханізаванага Лічэньня
даводзіць да ведама ўсіх кліентаў, а таксама ўстаноў і прадпрыемстваў г. Менску,
што з 1-га красавіка фабрыка будзе выконваць работы
ВЫКЛЮЧНА ПА ЗАЯВАХ І ДАГАВАРОХ,
якія будуць паданы фабрыцы ці заключаны з фабрыкай ва 10 дзен да пачатку н-ца.
Адначасова фабрыка